Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЛЮТАГА 2016 г. СЕРАДА № 25 (28135) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СІЛА МАСТАЦКАГА СЛОВА

Удзельнікам XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час»

Дарагія сябры!

Віншую вас з адкрыццём XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час».

Для нашага народа кніга з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнай, інтэлектуальнай і мастацкай спадчыны.

У Рэспубліцы Беларусь 2016 год аб'яўлены Годам культуры. Ён адзначаны такімі знакавымі юбілеямі, як 125-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча, 95-годдзе з дня нараджэння Івана Шамякіна, 120-годдзе з дня нараджэння Кандрата Крапівы. Творы класікаў літаратуры — гэта ўнікальны здабытак, які мы абавязаны беражліва захоўваць і перадаваць будучым пакаленням.

Упэўнены, што ваш форум выкліча непадробны інтарэс як у прафесіяналаў, так і ў вялікай колькасці гасцей, будзе садзейнічаць папулярызацыі якасных і змястоўных літаратурных твораў, прапагандзе кнігі ў маладзёжным асяроддзі, наладжванню ўзаемавыгадных кантактаў і развіццю міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва.

Жадаю ўсім удзельнікам плённай працы і творчага натхнення, а гасцям — цікавых сустрэч і новых уражанняў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

НАСУСТРАЧ ВЯСНЕ

Нетыпова цёплае надвор'е спакусіла гараджан вывезці на вуліцу ну зусім не лютаўскія сродкі перамяшчэння.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АД ВЫТВОРЦЫ ДА СПАЖЫЎЦА

Прэзідэнт даручыў наладзіць новую сістэму работы Міністэрства гандлю

Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў, прымаючы з дакладам міністра гандлю Уладзіміра Калтовіча.

Кіраўнік заявіў аб сваім намеры ўдзяляць найбольшую ўвагу рабоце сферы гандлю. Ён прыгадаў, што ў савецкія часы «гандаль быў тварам улады». Тое самае можна сказаць і сёння, бо чалавек сутыкаецца з ім кожны дзень. Але ў пераходны перыяд, па словах Прэзідэнта, «мы вырашылі, што, у прынцыпе, гандаль не патрэбны: ёсць прадпрыемствы, у залежнасці ад попыту і прапановы гандлюем...»

Гэта прывяло да таго, што гандаль, з аднаго боку, прыціснуў вытворцаў, а другой рукой забраў грошы ў спажыўца. «І ў нас, паглядзіце, сёння людзі, якія працуюць у гандлі, сталі самымі заможнымі. Я не супраць прадпрымальнікаў, я не супраць элементаў уласна гандлю, але я катэгарычна супраць незароблены грошай», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Я лічу, што грошы, перш за ўсё, павінны атрымліваць тыя, хто тавар вырабляе, а гандаль павінен мець сваю нейкую маржу або долю ад цаны гэтага тавару, але гандаль не павінен быць абдзіралаўкай. Я падводжу да таго, што якое б мы даследаванне ні праводзілі, народ больш за ўсё хвалюе рост цэн», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, у краіне трэба стварыць сістэму гандлю і паказаць усім, што гэта сур'ёзная галіна, і яна можа быць адносна сумленнай. Дамагчыся апошняга будзе няпроста. «Але падысці да гэтага, імкнуцца да гэтага трэба. І вы павінны ў краіне стварыць гэтую сістэму», — запатрабаваў Прэзідэнт. Звяртаючыся да міністра гандлю, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў:» Хто б вам што ні казаў, вы будзеце наўпрост адказваць перада мной. І перад народам». Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб у гэтым годзе былі прынятыя меры для працы ў роўных умовах усіх гандлёвых структур: дзяржаўных і прыватных, замежных і айчынных.

«І не глядзіце на забастоўкі нейкіх іпэшнікаў ці яшчэ кагосьці. Мы дакладна дамовіліся летась! Мы не пацаны, каб нас вадзіць за нос, тым больш мяне. Мы дамовіліся — у гэтым ключы трэба дзейнічаць», — сказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, трэба разумець, што, завёзшы ў краіну тавар нават добрай якасці, «мы настолькі ж загубілі сваю эканоміку, лёгкую прамысловасць. Не будзе яна развівацца». Тым больш калі завезены тавар — без дакументаў, без сертыфікатаў. «Слухайце! Гэта ж мы ўзаконьваем бандытызм, злачынцаў! Адных ловім, саджаем, а іншым дазваляем», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. «І потым, яны павінны разумець, што сертыфікацыя тавараў — гэта толькі першы крок. Мы ў гэтым годзе зробім усе крокі. Тавар, таваратранспартныя накладныя, усе суправаджальныя дакументы, сертыфікацыя — прыязджай, гандлюй. Няма гэтага — гандляваць не будзеш», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што надалей гэты бізнес будзе падкантрольны: «Тады лёгкая прамысловасць, гандаль будзе ў нас у Беларусі для ўсіх: і для іпэшнікаў, іншых прыватнікаў, і для дзяржпрадпрыемстваў — у роўных умовах. Яны гэтага заўсёды патрабуюць — дайце нам роўныя ўмовы. Вось роўныя ўмовы».

Паводле слоў Прэзідэнта, ствараючы новую сістэму гандлю ў краіне, трэба разгледзець пытанне і аб перадачы Мінгандлю функцый іншых ведамстваў: «Калі вы возьмеце антыманапольную службу сабе, калі возьмеце інспекцыю па кантролі за цэнаўтварэннем, за арганізацыяй гандлю, — калі ласка».

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад новага міністра арганізаваць «сістэму пасярэдніцтва паміж вытворцам і спажыўцом такім чынам, каб яны мелі сваё, але зароблена. Каб тыя, хто вырабляе тавар, меў сваё ад той цаны, якая сёння даходзіць да спажыўца». Прэзідэнт параіў міністру адарвацца ад усіх канонаў і стварыць «нармальную сістэму, якая б дазваляла арганізаваць прыватны і дзяржаўны гандаль».

Прэзідэнт даручыў таксама звярнуць увагу на працу пасярэднікаў. Паводле яго слоў, у гэтай сферы апошнім часам адзначаюцца буйныя правапарушэнні: «Дзесьці танна за мяжой купілі, тут да 200-300% даражэй прадалі, грошы вывелі ў афшор». Прэзідэнт дадаў, што не варта забываць і пра гандаль па экспарце, на знешніх рынках. «Гэта значыць трэба гэтую галіну зрабіць нармальнай, карыснай для дзяржавы і для людзей і прапісаць нармальныя правілы, каб і гандляры на нас не крыўдзіліся, яны патрэбныя, і каб народ перадусім быў задаволены той сістэмай, якая ў нас павінна існаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Калтовіч у сваю чаргу далажыў, што ў галіне занята 14% эканамічна актыўнага насельніцтва. Пры гэтым па меры развіцця гандаль сыходзіць з рынкаў. Так, за 10 гадоў удзельная вага рынкаў знізілася з 37% да 18%.

На сустрэчы размова ішла аб мерах па абароне ўнутранага рынку, аб неабходнасці павелічэння долі айчынных тавараў, недапушчэнні зніжэння асартыменту, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Асаблівая ўвага была ўдзелена тэме кантролю за пратэрмінаванымі выплатамі. У сувязі з гэтым прынята рашэнне аб стварэнні міжведамаснай камісіі, якая будзе займацца гэтымі пытаннямі.

Асобна ўвага была засяроджана на неабходнасці забеспячэння таварамі насельніцтва, якое пражывае ў малых гарадах. Прэзідэнт даручыў узяць гэтае пытанне на кантроль. Кіраўнік дзяржавы лічыць таксама неабходным аднавіць былую сістэму камбінатаў бытавога абслугоўвання, а яшчэ ствараць крамы крокавай даступнасці.

Прэзідэнт даручыў на працягу першага квартала стварыць неабходную прававую базу для дзейнасці міністра гандлю, а таксама прадставіць яму праект указа, у якім будуць прапісаныя новыя функцыі Міністэрства гандлю.

■ Будаўніцтва

Сёлета жыллёвы «квадрат» пацяжэе толькі на 5%

Такім чынам, сярэдні кошт стандартнага панэльнага жылля з дзяржпадтрымкай у 2016 годзе павінен скласці не больш чым 7,6 млн рублёў за квадратны метр

Аб гэтым паведаміў учора міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоль ЧОРНЫ на прэс-канферэнцыі, якая была прысвечана вынікам работы галіны і перспектывам развіцця на 2016 год. Паводле яго інфармацыі, летась у краіне было ўведзена ў эксплуатацыю 5 млн 54,6 тысячы квадратных метраў жылля, што складае 126,4% гадавога задання. Міністр адзначыў, што за гэты час арганізацыі галіны пабудавалі 1,6 млн «квадратаў» з дзяржпадтрымкай для чаргавікоў.

Між іншым, сітуацыя з будаўніцтвам падобнага жылля на бягучы год не самая аптымістычная. Сёлета падраздзяленням Мінбудархітэктуры запланавалі пабудаваць для чаргавікоў усяго 840 тысяч квадратных метраў жылля з дзяржпадтрымкай. На гэты конт Анатоль Чорны заўважыў, што «зніжэнне аб'ёмаў будаўніцтва з дзяржпадтрымкай звязана з тымі эканамічнымі цяжкасцямі, якія не дазваляюць больш сродкаў накіроўваць на такое жыллё. Аб'ёмы дзяржпадтрымкі зніжаюцца сёлета адразу на 3 трлн рублёў і складуць цяпер па годзе толькі каля 4,5 трлн рублёў».

Міністр адзначыў, што ў мінулым годзе ўдалося не дапусціць росту кошту квадратнага метра жылля з дзяржпадтрымкай. У выніку летась сярэдні кошт квадратнага метра ўтрымаўся ў межах 7 млн 188 тысяч рублёў (2014-ты — 6,97 млн рублёў). Пры гэтым атрымалася максімальна наблізіцца да адзінкі ў суадносінах кошту квадратнага метра з дзяржпадтрымкай да сярэдняй зарплаты па годзе — 1,07.

«А сёлета кошт метра павінен застацца на такім узроўні, які будзе адпавядаць не больш чым 5-працэнтнаму росту ў параўнанні з 2015 годам», — адзначыў міністр.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Погляд з пасажырскага крэсла

УБЕРАГЧЫСЯ АД КАНКУРЭНЦЫІ

ЧАМУ ТАКСІСТЫ СУПРАЦЬ НОВАГА СЭРВІСУ?

На мінулым тыдні Мінск увайшоў у спіс гарадоў, жыхары якіх разам з традыцыйнымі спосабамі выкліку таксі могуць карыстацца сервісам Uber — папулярным мабільным дадаткам. Хутчэй за астатніх на навіну адрэагавалі сталічныя таксісты — дзясяткі кіроўцаў сабраліся на стыхійную сустрэчу, падчас якой абмяркоўвалі план дзеянняў па абароне сваіх правоў. Карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў разабрацца, што насамрэч прынясе ў Беларусь Uber.

Заказ аўтамабіля адбываецца пры дапамозе праграмы на смартфоне. Дадатак прапаноўвае карыстальніку некалькі варыянтаў машын паблізу, пасля чаго пасажыр выбірае кіроўцу. У салоне — ніякіх звыклых лічыльнікаў і дыспетчарскай апаратуры, толькі ўсё той жа смартфон. Дыстанцыю паездкі і яе час вызначаюць праз датчыкі прылады, яна ж і разлічвае кліента. Даставаць кашалёк не трэба — акаўнты Uber прывязаныя да банкаўскіх картак. Пасля паездкі — выстаўленне адзнак: пасажырам — кіроўцу і наадварот. Такім чынам, з цягам часу нядобрасумленныя таксісты і карыстальнікі пазбаўляюцца права карыстацца Uber-ам.

Дарэчы, таксісту ўладкавацца ў кампанію на працу з машынай, старэйшай за 5 гадоў, не атрымаецца. Пазнаць аўто Uber цяжка — ніякіх звыклых «шашак» і налепак на бартах. Працаваць такім чынам могуць практычна ўсе ўладальнікі аўтамабіляў сярэдняга (Uber X) і прадстаўнічага (Uber Black) класаў. Час «таксавання» кіроўца вызначае сам — графік абсалютна вольны.

Ключавое пытанне — кошты. Тарыфы ў сервісу даволі дэмакратычныя. Паездка на папулярным Uber X каштуе 5 700 рублёў за кіламетр і 600 рублёў за хвіліну (лічбы складаюцца), яшчэ 27 тысяч спішуць за падачу машыны. Гэта параўнальна з ужо існымі ў Мінску службамі таксі. Паездка на прэміяльным Uber Black у сярэднім абыходзіцца прыкладна ў 1,5 раза даражэй.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Валянцін РЫБАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў:

«Сённяшнія інвестыцыі беларускай дзяржавы ў адукацыю, ахову здароўя, прафесійную падрыхтоўку насельніцтва, стварэнне новых магчымасцяў для забеспячэння занятасці і годнай працы для моладзі будуць садзейнічаць устойліваму эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю грамадства. Асаблівую ўвагу кіраўніцтва Беларусі ўдзяляе забеспячэнню сацыяльнай абароны, правоў пажылых людзей і інвалідаў, маладых сем'яў, сем'яў з дзецьмі. Традыцыйная сям'я, яе дабрабыт, інтарэсы і прыярытэты павінны заняць належнае месца ў працэсе пераасэнсавання ролі сацыяльнага развіцця і пабудовы ўстойлівага грамадства».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.02.2016 г.

Долар ЗША	21959,00	▲
Еўра	24561,00	▲
Рас. руб.	280,17	▼
Укр. грыўня	844,58	▲

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У Германіі сутыкнуліся цягнікі

Пры сутыкненні двух цягнікоў пацярпела каля 150 чалавек. Інцыдэнт адбыўся прыкладна за 60 кіламетраў на паўднёвы-захад ад Мюнхена, паведамляе The Local. Дакладная колькасць загінулых на момант здачы нумара не паведамлялася. Паводле інфармацыі выдання Focus, катастрофа забрала жыцці васьмі чалавек. Афіцыйны прадстаўнік федэральнай паліцыі ФРГ Райнэр Шарф паведаміў пра чатырох загінулых. «Мы зыходзім з таго, што чатыры чалавекі загінулі, амаль 90 паранена, з іх 10 чалавек знаходзяцца ў цяжкім стане», — заявіў ён. Як растлумачылі ў паліцыі, адбылося лабавое сутыкненне двух цягнікоў. Вагоны аднаго з іх сышлі з рэек і перакуліліся. Прычыны катастрофы пакуль невядомыя. Версія з тэрактам не разглядаецца.

Паслы выказалі заклапочанасць эпідэміяй ВІЧ у Эстоніі

Паслы Вялікабрытаніі, Фінляндыі і ЗША ў Эстоніі выступілі з сумесным зваротам да канстытуцыйнай камісіі парламента гэтай краіны, у якім папрасілі прызнаць наяўнасць у краіне эпідэміі ВІЧ / СНІД і стварыць спецыяльную камісію па рашэнні праблемы. Як гаворыцца ў звароце, сітуацыя з ВІЧ у Эстоніі «выклікае глыбокую заклапочанасць», паведаміў партал газеты Postimees. Паслы адзначаюць, што, «паводле стандартаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, становішча ў Эстоніі кваліфікуецца як эпідэмія, якая пагражае шматлікім грамадскім групам». Яны кажуць, што першапачаткова хвароба распаўсюджвалася ў асноўным сярод ін'екцыйных наркаманаў, аднак у 2014 годзе яны склалі толькі 23% ад агульнай колькасці інфіцыраваных, а каля паловы заразіліся шляхам гетэрасексуальных кантактаў. Падобнае развіццё падзей пагражае кожнаму жыхару Эстоніі, іх партнёрам і сябрам з міжнароднай супольнасці, а таксама турыстам, лічаць паслы.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Дзярждоўг ЗША пераваліў за 19 трыльёнаў долараў

Доўг амерыканскага федэральнага ўрада афіцыйна перайшоў адзнаку ў 19 трыльёнаў долараў. Пра гэта паведамляе The Washington Times. Такі ўзровень быў пройдзены яшчэ ў канцы студзеня. Сума складае прыкладна 103 працэнты ВУП краіны. З агульнай сумы 13,7 трыльёна долараў прыпадае непасрэдна на публічны доўг, які трымаюць кампаніі і прыватныя асобы. Яшчэ 5,3 трыльёна складае ўнутрыдзяржаўная запазычанасць урада перад Федэральнай рэзервовай сістэмай. За час прэзідэнцтва Барака Абамы даўгі дзяржавы практычна падвоіліся, падняўшыся на восем трыльёнаў долараў за сем гадоў. Прыкладна такую ж дынаміку паказвалі абавязацельствы дзяржавы ў гады кіравання папярэдняга прэзідэнта Джорджа Буша-малодшага.

КАРАТКА

Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў 2015 годзе склаў Br15,1 трлн, або 1,7 працэнта да ВУП. Даходы склалі Br167,2 трлн, або 101,5 працэнта ўдакладненага гадавога плана.

«Зніжэнне выдаткаў на жыллёва-камунальныя паслугі ў 2016 годзе запланавана на 15% і далей да 2020 года па 5% штогод. Кампенсацыю тарыфаў на ЖКП насельніцтвам плануецца ажыццявіць у тры этапы: канец 2016 года — выхад на 50% кампенсацыі выдаткаў, канец 2017 года — на 75%, да канца 2018 года, — на 100%», — заявіў міністр эканомікі Беларусі Уладзімір Зіноўскі на Прэзідыуме Савета Міністраў.

Сістэма аўтаматычнага пагранічнага кантролю, якая выкарыстоўвае прынцып электроннай біяметрычнай ідэнтыфікацыі асобы, можа з'явіцца ў аўтадарожных пунктах пропуску на граніцы Беларусі.

Вікторыя Азаранка кваліфікавалася на Алімпійскія гульні — 2016 у Рыа-дэ-Жанэйра. Гэта пацвярджае афіцыйны адказ, атрыманы напярэдадні БТФ ад Міжнароднай тэніснай федэрацыі. Білеты на спаборніцтвы летніх Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Рыа-дэ-Жанэйра ўжо паступілі ў продаж у Беларусі.

КЛЮЧ АД ЛІТАРАТУРЫ — КЛЮЧ АД БУДУЧЫНІ

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сёння ў межах II Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час: пераемнасць пакаленняў» (а гэта адна з важнейшых падзей XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу) распачаў работу семінар маладых літаратараў Беларусі і Расіі. Маладыя творцы сабраліся ў беларускай сталіцы, каб знайсці новых сяброў і наладзіць творчыя кантакты, абмяняцца меркаваннямі, паўдзельнічаць у дыскусіях і, натуральна, атрымаць парады ад старэйшых калег і настаўнікаў — ужо прызнаных майстроў паэзіі, прозы, публіцыстыкі і літаратурнай крытыкі.

СТАР. 2

У РЭСУРСУ ЁСЦЬ РЭЗЕРВ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка лічыць, што магчымасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы выкарыстоўваюцца не ў поўнай меры. Пра гэта ён заявіў на сустрэчы з генеральным сакратаром АДКБ Мікалаем Бардзюжам.

«Мы недастаткова выкарыстоўваем гэты рэсурс. Мы проста ці не разумеем, што малаверагодна, або проста ў нас нейкія іншыя думкі. Хоць АДКБ — гэта не проста пляцоўка, а арганізацыя, дзе мы павінны сумесна дзейнічаць і дэманстраваць нашу рашучасць па абароне нашай бяспекі, бяспекі дзяржаў, якія ўваходзяць у Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы. І нават тыя, хто не ўваходзяць, павінны, гледзячы на нас, усё ж такі мець нейкую надзею, што мы забяспечым гэтую бяспеку, перш за ўсё нашым суседзям», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што перш за ўсё мае на ўвазе народы, якія хацелі б жыць у бяспецы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэтыя пытанні абмяркоўваліся і на апошняй сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. «Мы з Прэзідэнтам Расіі, напэўна, больш за палову часу абмяркоўвалі гэтыя важныя пытанні нашай бяспекі: усё, што адбываецца на заходнім напрамку, усё, што на поўдні ў нас з Украінай звязана, Сірыя — гэта вялікі клубок, адносіны Расійскай Федэрацыі з Турцыяй», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Ён звярнуў увагу на тое, што праблемы эканомікі абмяркоўваліся ва ўзаемасувязі з бяспекай.

На сустрэчы закраналіся пытанні, якія на сённяшні дзень больш за ўсё непакояць краіны АДКБ. Мікалай Бардзюжа адзначыў, што калі ў цэлым браць сітуацыю і глядзець, напрыклад, на Еўропу, на Блізкі Усход, то ў рэгіёне АДКБ яна адносна стабільная. Калі гаварыць пра Усходнееўрапейскі рэгіён, то тут неспакой перш за ўсё выклікае магчымасць ці патэнцыйная пагроза наплыву бежанцаў. У гэтай сувязі АДКБ праводзяцца мерапрыемствы па лініі міграцыйных службаў, пагранічных ведамстваў. Другая праблема — узмацненне ваеннай інфраструктуры каля мяжы АДКБ. Мікалай Бардзюжа адзначыў, што сітуацыя трымаецца пад кантролем і пры неабходнасці будуць прымацца адпаведныя меры.

■ На слыху

ЗАРАБІЦЬ НА «ЗДАГАДКАХ» НЕ ВЫЙДЗЕ

Асабістую адказнасць за паведамленне загадзя лжывых звестак пра факты карупцыі ніхто не адмяняў

Пастанова аб узнагароджанні грамадзян за паведамленні аб карупцыйных злачынствах, прынятая Саветам Міністраў 5 лютага, павысіць актыўнасць людзей у супрацьдзеянні карупцыі, заявіў начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генеральнай пракуратуры Беларусі Ігар Грэйба.

Практыка ўзнагароджання за інфармацыю пра факты карупцыйных злачынстваў не з'яўляецца навіной. «Падобныя выплаты распаўсюджаныя ў шэрагу замежных краін, а ў Беларусі ўзнагароджанні прадугледжаны адпаведным заканадаўствам аб аператыўна-вышуковай дзейнасці. Апроч таго, у нас ёсць пастанова 1998 года ў рэдакцыі 2015 года, у якой прапісваецца магчымасць выплаты праваахоўнымі органамі сваім супрацоўнікам, а таксама грамадзянам за актыўны ўдзел у выяўленні і спыненні фактаў супрацьпраўнай дзейнасці, затрыманні асоб, якія здзейснілі асабліва небяспечныя цяжкія злачынствы», — дадаў ён. Начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генпракуратуры засяродзіў увагу, што людзі павінны ў поўнай меры ўсведамляць усю ступень адказнасці за паведамленні ў праваахоўныя органы непраўдзівых і загадзя лжывых звестак. Згодна з пастановай, выплата ўзнагароджання фізічнай асобе праводзіцца ў выпадках прадастаўлення інфармацыі, прадметаў і дакументаў, якія садзейнічалі выяўленню карупцыйнага злачынства, прадастаўлення звестак пра месцазнаходжанне асобы, што вышукваецца, якая ўчыніла карупцыйнае злачынства, прадастаўлення інфармацыі пра месцазнаходжанне грашовых сродкаў і іншай маёмасці, атрыманых у выніку карупцыйнага злачынства, садзейнічання прадухіленню або кампенсацыі шкоды, нанесенай такім злачынствам, і аказання іншага садзейнічання органам крымінальнага пераследу, што мела значэнне для процідзеяння карупцыйным злачынствам.

Калі гаворка ідзе пра цяжкае ці асабліва цяжкае злачынства, то выплачваецца да 50 базавых велічынь, пры менш цяжкім — да 30 базавых. «Праводзяцца выплаты кампенсавальнага характару да 10 базавых велічынь на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць панесеныя фізічнай асобай выдаткі пры прадастаўленні інфармацыі», — адзначаецца ў дакументе. Выплата прызначаецца пракуратурай на падставе хадайніцтва органа крымінальнага пераследу пры прыняцці рашэння па крымінальнай справе, што паступіла для накіравання ў суд, і ў некаторых іншых выпадках. Пад фізічнымі асобамі тут не маюцца на ўвазе тыя, хто з'яўляецца вайскоўцамі або супрацоўнікамі дзяржорганаў і іншых арганізацый, якія змагаюцца з карупцыяй. Не распаўсюджваецца дзеянне дакумента і на ўдзельнікаў працэсу пры вытворчасці па крымінальных справах. «Выплата ўзнагароджання і іншых выплат не праводзіцца фізічным асобам, якія аказваюць садзейнічанне ў выяўленні, спыненні, раскрыцці або расследаванні карупцыйнага злачынства, у здзяйсненні якога яны ўдзельнічалі», — падкрэсліваецца ў пастанове.

Міністэрства фінансаў Беларусі павінна вызначыць парадак і форму выплаты ўзнагароджання грамадзянам за паведамленні пра выпадкі карупцыі. «А мы вынесем адпаведнае рашэнне, якое накіруем у фінансавыя органы. Наяўнымі ці па банкаўскай картцы, нейкім іншым спосабам — вырашаць не нам», — сказаў Ігар Грэйба. Атрымаць узнагароджанне за паведамленне аб факце карупцыі грамадзянін зможа па завяршэнні расследавання крымінальнай справы. Яно не будзе абкладацца падаткам. «Усе выплаты і ўзнагароджанні, згодна з законам аб барацьбе з карупцыяй, не будуць паказвацца ў адпаведных дэкларацыях аб даходах і маёмасці».

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

КЛЮЧ АД ЛІТАРАТУРЫ — КЛЮЧ АД БУДУЧЫНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ напярэдадні семінара пажадаў яго ўдзельнікам плённай працы і звярнуў увагу на тое, што заўсёды вельмі важна знаходзіць кропкі судакранання, шукаць патрэбныя словы для разумення адзін аднаго.

Калі паспрабаваць намаляваць калектыўны партрэт сучаснага маладога пісьменніка, то якія рысы будуць вылучацца ў гэтым вобразе? Хто і якія яны — будучыня літаратуры? У Інстытуце літаратуры і мастацтва імя М. Ауэзава (Казахстан) шмат увагі надаецца творчасці маладых аўтараў. Вось што распавяла **ўдзельніца сімпозіума, літаратуразнаўца Святлана АНАНЬЕВА**:

— Летась у нашым інстытуце пабачыла свет калектыўная манаграфія «Літаратура народаў Казахстана», дзе досыць вялікая ўвага надаецца маладым творцам. Гэта, да прыкладу, паэт і празаік, які піша ў традыцыях еўрапейскай літаратуры, Канстанцін Серабранскі, дарэчы, эколаг па адукацыі. Яго вельмі цікава чытаць, гэты аўтар многа падарожнічае па свеце, сам выдае часопіс. Яшчэ адзначу паэтаў Марата Ісенава і Алену Зейферт. Цікава, што ў маладых творцаў — новыя тэмы, новыя ідэі. Яны хутчэй усталёўваюць кантакты, і гэта дазваляе ім часцей перакладацца і выдавацца за мяжой.

Якія парады могуць даць ужо сталыя творцы маладым аўтарам? **Пісьменнік з Літвы**, добры сябар Беларусі **Яронімас ЛАУЦЮС**, які часта праводзіць майстар-класы для аўтараў-пачаткоўцаў, зазначае:

— Пошук сябе, свайго месца ў гэтым складаным жыцці — вось што хвалюе маладых пісьменнікаў. Аўтарам-пачаткоўцам трэба даць імпульс да разумення адказнасці перад сабой, бо менавіта ў іх руках знаходзіцца ключ ад жыцця. Маладым вельмі важна ўсвядоміць сябе творцамі жыцця, а не яго сузіральнікамі. Вельмі важна не ненавідзець, працаваць не толькі на вынік, але і дзеля добрага настрою.

А чаго чакаюць ад семінара маладых літаратараў самі творцы? З якімі думкамі і спадзяваннямі прыехалі ў Мінск? **Васіль ПАПОЎ, паэт** на нашы пытанні адказвае так:

— Маё дзяцінства прайшло ў сібірскай вёсцы, што ў Іркуцкай вобласці. Магчыма, менавіта з гэтай прычыны я і пішу ў асноўным пра жыццё сельскіх жыхароў. Некаторыя кажуць, што гэтая тэма сёння неактуальная. Але мне падаецца — зусім наадварот. Гэта нібыта ідзе знутры: калі пачынаю пісаць, то хочацца маляваць карціны прыроды, вясковага побыту, распавядаць, як жывуць людзі ў драўляных хатах, як працуюць на зямлі. Канечне, удзел у семінары маладых літаратараў мне вельмі цікавы. Цікава паглядзець, якія тэмы хвалююць маіх калег, пазнаёміцца з імі. Натуральна, маладыя творцы пішуць і пра горад, і пра адносіны ў інтэрнэт-прасторы. На маю думку, у любым літаратурным жанры можна працаваць у рамках духоўнай культуры, а не высмейваць рэчаіснасць.

І сапраўды, сёння, у час, калі межы паміж краінамі становяцца ўсё больш умоўнымі, маладым творцам, адкрытым для новых уражанняў, вельмі лёгка пасябраваць з калегамі, дамовіцца з выдаўцамі, знайсці натхненне для вершаў і раманаў. І хто ведае, магчыма, менавіта дзякуючы семінару маладых літаратараў, што сёння праходзіць у Мінску, дарогу ў шырокі свет атрымаюць новыя ідэі маладых творцаў, іх імёны стануць папулярнымі і запатрабаванымі ў чытачоў.

Марына ВЕСЯЛУХА.

Сімпозіум «Пісьменнік і час: традыцыі і пераемнасць», які пачаў учора сваю працу ў межах XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, сабраў літаратараў з 15 краін свету. Актыўны ўдзел у дыскусіях, «круглых сталах», семінары маладых пісьменнікаў прымаюць і яшчэ прымуць паэты, празаікі, літаратурныя крытыкі і з Беларусі. Вось якімі першымі ўражаннямі дзеляцца госці і гаспадары сімпозіума.

Алесь БАДАК, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

— Яшчэ нядаўна з размоў з калегамі з краін СНД было няцяжка зразумець, што іх веданне беларускай літаратуры абмяжоўваецца, у асноўным, імёнамі, якія піку сваёй вядомасці дасягнулі ў савецкі час. Ды і наша ўяўленне пра іх літаратуры заканчвалася на той жа эпосе. Сёння сітуацыя вельмі змянілася. Не толькі паасобныя творы ў перыядычным друку — аўтарскія кнігі сучасных айчынных пісьменнікаў выходзяць і ў Расіі, і ва Украіне, і ў Азербайджане, Арменіі, Таджыкістане, іншых постсавецкіх краінах. Тое ж можна сказаць і пра адваротны працэс. Асабліва радуе, што наладжваюцца кантакты паміж маладымі літаратарамі, за якімі будучыня не толькі нашых літаратур, але і нашых міжлітаратурных узаемаадносін.

Валерый КАЗАКОЎ, сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі:

— 23 раз у Беларусі праходзіць Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. А ў яе рамках — унікальнае для постсавецкай прасторы мерапрыемства, на якое з'язджаюцца пісьменнікі, літаратары і выдаўцы амаль з усіх былых рэспублік Савецкага Саюза. Не, гэтыя сімпозіумы і семінары далёка не настальгічныя сустрэчы старэючых мэтраў некалі вялікай літаратуры, гэта знакавыя для нашага хуткабежнага часу сустрэчы, якія даюць энергічны імпульс усёй узаемазвязанай і жывой літаратуры нашых народаў. Асабліва значэнне гэты форум набывае сёння, калі свет ужо па-сапраўднаму вар'яцее і на поўным сур'ёзе гатовы да новай, і хутчэй за ўсё апошняй сусветнай бойкі. Ні правадыры, ні палітыкі не ў стане спыніць катастрофу, якая насоўваецца на грамадствы і краіны, толькі пісьменнікі, толькі соль і сумленне народаў, могуць спыніць варажнечу. Галоўнае — пачуць іх галасы.

Мяркую, што мы невыпадкова сабраліся на шматпакутнай беларускай зямлі. У апошнія гады гэтая рэспубліка, гэтая дзяржава становіцца цэнтрам свету і ўзаемаадносін нават варожых паміж сабою бакоў. Заўважу, у той час, калі некаторыя дзяржавы думаюць толькі пра сваю выключнасць і ўласную шматзначнасць. І гэтая беларуская работа прыносіць свае вынікі, дае свой плён. Гэта заўважна на самым шырокім сусветным узроўні. Не выпадкова і Нобелеўская прэмія дадзена беларускай пісьменніцы. Пасля развалу Савецкага Саюза гэта першая і пакуль адзіная такога кшталту адзнака мастакоўскага таленту. Прэмія сярод усіх незалежных дзяржаў. Так што, толькі ў беларускай літаратуры ёсць свой Нобель. Упэўнены, што і сённяшні сімпозіум унясе сваю лепту ў адраджэнне нашай чалавечнасці і добрасуседства, а галоўнае — дапаможа маладым пісьменнікам напоўніцу, ва ўвесь голас заявіць пра сябе і сваю творчасць.

...НЕСЦІ ЛЮДЗЯМ СВАЁ, БРАЦЬ ЛЕПШАЕ АД ІНШЫХ

Юлія АЛЕЙЧАНКА, рэдактар аддзела часопіса «Полымя», літаратуразнаўца, паэт, перакладчык:

— Сімпозіум «Пісьменнік і час» павінен не толькі канстатаваць рэаліі сучаснага літаратурнага працэсу, але і акрэсліць вострыя надзённыя праблемы. Як не згубіць «твар» нацыянальных літаратур у эпоху глабалізацыі? Якія фактары станоўчым чынам уплываюць на фарміраванне ментальнай карціны свету? Як не губляць традыцыі і ўпэўнена крочыць наперад у шчыльна напоўненай інфармацыйнай прасторы? Гэтыя і іншыя пытанні мусяць быць акрэслены і асэнсаваны творчай элітай розных краін, бо паліфанія нараджае цэласную фактуру гучання.

Беларуская літаратура набывае ўсё большы рэзананс у свеце. Таму што і самі беларусы актыўна прапагандуюць іншыя культуры і літаратуры. Нармальныя сувязі грунтуюцца не на лозунгах пра дружбу народаў, а на ведах, якія потым перадаюцца праз школу, праз мастацкі пераклад, праз жыццё. «Полымя», «Нёман», «ЛіМ» перыядычна рыхтуюць спецыяльныя выпускі, прысвечаныя літаратуры краін замежжа. Так і «беларускія» нумары пабачылі свет у перыёдыцы Расіі, Казахстана, Туркменістана, Арменіі, Таджыкістана... Супольныя кніжныя праекты яднаюць Выдавецкі дом «Звязда» з кітайскімі выдавецтвамі. А кніжная серыя «Сугучча сэрцаў» і адпаведны інтэрнэт-партал знаёмяць беларусаў з сучасным развіццём літаратуры краін СНД. Многае залежыць і ад асабістых кантактаў, творчых ініцыятыў асобных людзей. Напрыклад, у Таджыкістане беларускую літаратуру актыўна прапагандуе Ато Хамдам, у Казахстане — Святлана Ананьева, у Азербайджане — Чынгіз Алі аглу.

Як бачым, трывалыя адносіны могуць будавацца толькі на адкрытым, шчырым дыялогу і ўзаемаўзбагачэнні. «Каб несці людзям сваё, каб браць лепшае ад іншых», як раіў Вацлаў Ластоўскі яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя.

Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА і Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Абітурыент, не прапусці!

Пагрузіцца ў свет прафесій

можна будзе на XIV міжнароднай спецыялізаванай выставе «Адукацыя і кар'ера», якая пройдзе ў сталічным Палацы спорту з 11 па 13 лютага

За 13 гадоў свайго існавання яна заваявала рэпутацыю найважнейшай падзеі для людзей, якія будуюць сваю адукацыйную траекторыю, і стала своеасаблівым компасам для моладзі, якая яшчэ не вызначылася з выбарам прафесіі і навучальнай установы. Наведаць за пару гадзін мноства ВНУ, каледжаў, ліцэяў і гімназій, азнаёміцца з ІТ-тэхналогіямі навучання і навейшым вучэбным абсталяваннем — калі яшчэ такое магчыма?

Удзел у выставе бяруць установы адукацыі з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы, Турцыі, Польшчы, Эстоніі, Чэхі і Славакіі... Безумоўна, цікавасць падлеткаў прыцягнуць тэматычныя майстар-класы па карвінгу, вырабе дэкаратыўнай рашоткі, разьбе і роспісе па драўніне, модным пляценні, дызайне пазногцяў, ручным ткацтве дываноў, мастацкай вышыўцы сувеніраў і іншыя. Напрыклад, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж кулінарыі запрашае ўсіх ахвотных на майстар-клас «Цуды сваімі рукамі» — па мастацкім роспісе пернікаў, дзе будзе магчымасць пад кіраўніцтвам прафесіяналаў вырабіць салодкі падарунак да Дня Святога Валянціна.

Да таго ж упершыню на адной пляцоўцы сустрэнуцца дзве самыя папулярныя выставы «Адукацыя і кар'ера» і «Адукацыйнае асяроддзе і вучэбныя тэхналогіі». На думку экспертаў, аб'яднанне гэтых двух мерапрыемстваў пад адным дахам пойдзе толькі на карысць абодвум, паколькі дазволіць стварыць агульнае прафесійнае поле для наладжвання дзелавых кантактаў і абмеркавання шляхоў укаранення сучасных тэхналогій непасрэдна ў вучэбны працэс.

Сваю прадукцыю і распрацоўкі прадставяць каля трыццаці вытворцаў і пастаўшчыкоў тэхналагічных рашэнняў, прадуктаў і паслуг: дзяржаўнае прадпрыемства «Актыў БДУ», «Вучпрамтэхна», РУП «Белкартаграфія», БДУІР, «ЗАТ «Белсофт», расійскія кампаніі і арганізацыі «Фірма Хопер», ТПК «Школьнік»... Арыгінальныя праекты і методыкі выкладання ў жывой гульнявой форме прадэманструе вядомая кампанія «Робатрэк» — стваральнік і вытворца робататэхнічных набораў і канструктараў для трох узроставых груп (пачынаючы з 5-ці гадоў).

Дзелавая праграма выставы насычана мерапрыемствамі, якія будуць цікавыя і карысныя і выкладчыкам, і студэнтам, і абітурыентам. А ключавым момантам стане III адкрытая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Дарожная карта інфарматызацыі: ад мэты да выніку».

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Прырода і мы

КАБ ВОЛЬНА ЖЫЛІ ЗУБРЫ

Умацаванне мінеральна-сыравіннай базы краіны, захаванне біяразнастайнасці, укараненне прынцыпаў «зялёнай эканомікі» і ўдасканаленне працы з грамадскасцю стануць аднымі з прыярытэтных кірункаў працы Мінпрыроды на бліжэйшы час.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як расказаў падчас выніковай калегіі ведамства **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА**, за апошні год, па папярэдняй ацэнцы, нягледзячы на павелічэнне магутнасцяў некаторых галін прамысловасці, у нашай краіне на 0,5% знізіўся валавы выкід забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, а аб'ём адходаў, якія ўцягваюцца ў гаспадарчы абарот, сёння складае каля 90% (за выключэннем буйнатанажных). У краіне налічваецца 1265 асоба ахоўваемых прыродных тэрыторый, агульная плошча якіх дасягае каля 8,8% ад плошчы ўгоддзяў.

— Прыкладам паспяховай працы ў вобласці захавання біяразнастайнасці служыць павелічэнне ў краіне колькасці зуброў, якая ў канцы 2015 года дасягнула 1270 асобін, — адзначыў Андрэй Каўхута. — Акрамя таго, наша краіна займае першае месца ў свеце па колькасці зуброў, якія жывуць вольна.

Пра паляпшэнне экалагічнага становішча ў краіне гаварыць і замежныя спецыялісты. У трэцім Аглядзе выніковасці экалагічнай дзейнасці, арганізаваным Еўрапейскай эканамічнай камісіяй ААН, міжнародныя эксперты адзначылі вялікі прагрэс з 2005 года па паляпшэнні якасці прыродаахоўнага заканадаўства краіны і сістэмы экалагічнага падаткаабкладання, наяўнасці развітай сістэмы стратэгічнага планавання і іншых кірунках.

У мінулым годзе карэкціроўку прайшлі чатыры экалагічныя законы: «Аб асоба ахоўваемых прыродных тэрыторыях», «Аб ахове азонавага слоя», «Аб ахове навакольнага асяроддзя», «Аб жывёльным свеце». У 2016-м эколагі і заканадаўцы плануюць падрыхтаваць новую рэдакцыю Кодэкса аб нетрах, Закон «Аб экалагічнай экспертызе, стратэгічнай ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе».

Працягнецца праца і з парушальнікамі прыродаахоўнага заканадаўства. У 2015 годзе органы Мінпрыроды выявілі 1839 фактаў нанясення шкоды навакольнаму асяроддзю на суму 103 млрд рублёў. Самыя значныя з іх адбываліся ў вобласці абыходжання з адходамі, аховы атмасфернага паветра, водных рэсурсаў, выкарыстання і аховы земляў і расліннага свету.

Змяніць сітуацыю, па меркаванні кіраўніцтва Мінпрыроды, дапаможа паляпшэнне якасці праверак тэрытарыяльнымі органамі, пашырэнне дыстанцыйных метадаў кантролю, умацаванне кантакту з насельніцтвам і грамадскімі арганізацыямі.

Адной з асноўных задач ведамства ў бліжэйшы час стане забеспячэнне эканомікі краіны мінеральна-сыравіннымі і іншымі прыроднымі рэсурсамі. Працягнецца развіццё кірункаў, звязаных з выкарыстаннем узнаўляльных крыніц энергіі.

Па словах **першага намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Іі МАЛКІНАЙ**, усё большую актуальнасць у сферы эканамічнай і экалагічнай бяспекі набывае ўкараненне экалагічных і высокаразвітых тэхналогій. Так, на Папяровай фабрыцы Дзяржзнака ў Барысаве арганізавана вытворчасць офіснай паперы з другасных рэсурсаў, на брэсцкім ПКУП «Камунальнік» створаны комплекс па перапрацоўцы драўняных адходаў у біяпаліва.

— Асноўныя сілы неабходна сканцэнтраваць на рэалізацыі праектаў, накіраваных на рэгіянальнае развіццё, — галоўным чынам тых раёнаў, якія не валодаюць значным прамысловым патэнцыялам, — адзначыла Ія Малкіна.

Іншымі кірункамі дзейнасці Мінпрыроды таксама павінны стаць развіццё экалагічнага турызму, барацьба з інвазіўнымі відамі раслін, удасканаленне працы па навядзенні парадку на зямлі і іншае.

Вераніка КОЛАСАВА. *kolasava@zviazda.by*

■

УБЕРАГЧЫСЯ АД КАНКУРЭНЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што гэта значыць для звычайных карыстальнікаў? Вядома, канкурэнцыя яшчэ нікому не замінала, наадварот — яна заўсёды на руку пакупніку. Магчымасць нядорага перасоўвацца па горадзе на новых аўтамабілях са зручнай і сучаснай сістэмай замовы і разліку — гэта выдатна. Ды і сістэма водгукаў і абароненасці як кліента, так і кіроўцы заслугоўвае станоўчай адзнакі.

На практыцы ж, Uber X у Беларусі пакуль працуе не так дасканала — удзень вольную машыну часам даводзіцца чакаць даволі доўга. Хутчэй за ўсё, сітуацыя з цягам часу зменіцца ў лепшы бок, калі працаваць з новым сэрвісам пачне больш кіроўцаў. Мяркуючы па водгуках у інтэрнэце, сам узровень абслугоўвання пытанняў у большасці пасажыраў не выклікае. Асабліва такі транспарт падабаецца моладзі — ніякага табе расійскага шансону з калонак ці непрыемных пахаў у салоне. У дадатак — развітая сістэма зніжак і бонусаў. Так, першую паездку на Uber X цяпер можна здзейсніць увогуле бясплатна, дастаткова ўвесці ў дадатку спецыяльны прама-код.

Што ж не задавальняе «традыцыйных» таксістаў? Галоўнае пытанне да Uber — няроўныя ўмовы працы. Маўляў, аплата страхоўкі, дарожнага збору, абслугоўванне таксометраў і шматлікія праверкі з боку дзяржавы закранаюць толькі звычайных таксістаў, тым жа, хто працуе з Uber, такія працэдуры не страшныя. Але прадстаўнікі сэрвісу сцвярджаюць, што ўсе кіроўцы афармлены як індывідуальныя прадпрымальнікі, маюць страхоўку, праходзяць кантроль з боку медыкаў і механікаў, а таму пытанняў з боку закона быць да іх не павінна... Юрыдычна Uber — гэта ўсяго толькі праграма, якая прадастаўляе асобным кіроўцам паслугі дыспетчара. Беларускім транспартным заканадаўствам магчымасць аказання

дыспетчарскіх паслуг камп'ютарам пакуль ніяк не рэгламентуецца.

Тым не менш, ужо сёлета будзе распрацавана новая рэдакцыя Закона «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках», пра гэта яшчэ ў канцы мінулага года казаў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Леанід Мажэйка. Цалкам магчыма, што зусім хутка паняцце анлайн-дыспетчарскай службы і, адпаведна, сэрвісаў кшталту Uber, увойдзе ў заканадаўчы ўжытак нашай краіны.

У Міністэрстве транспарту і камунікацый даваць ацэнкі і каментаваць прыход Uber у Беларусь пакуль не спяшаюцца. І гэта не дзіўна — рэч для Беларусі новая, пакуль не зусім зразумела, у чыю зону адказнасці ўваходзіць праблема.

Трэба заўважыць яшчэ адзін аспект — прыход Uber не задавальняе далёка не ўсіх таксістаў сталіцы. Па ацэнках журналістаў, на сустрэчу ў выхадныя прыйшло каля 80 кіроўцаў. Гэта пры тым, што афіцыйна зарэгістраваных перавозчыкаў у Мінску каля 6 тысяч. У размове з карэспандэнтам «Звязды» кіраўнік адной са сталічных службаў таксі сказаў, што ў яго супрацоўнікаў ніякіх пытанняў да Uber няма, яны працягваюць працаваць, як і раней.

Дарэчы, прыход Uber у большасці краін таксама суправаджаўся пратэстамі «звычайных» таксістаў, таму Беларусь далёка не першая ідзе па гэтым шляху. У Францыі, напрыклад, дайшло да масавай забастоўкі і сутыкненняў з паліцыяй. Праўда, там галоўнай праблемай было існаванне закрытага цяпер сэрвісу Uber Pop — самага таннага віду перавозак ад Uber, кіроўцамі якога могуць быць простыя аўтааматары без аніякай рэгістрацыі. Тым не менш з цягам часу незадаволенасць таксістаў ва ўсіх краінах сыходзіла на нуль, і традыцыйныя службы пачыналі суіснаваць з новымі, прычым агульная колькасць перавозак толькі павялічвалася. Хутчэй за ўсё, такі сцэнарый чакае і Беларусь, бо заўсёды знойдуцца тыя, каму зручней выклікаць машыну пры дапамозе звыклага званка ў дыспетчарскую.

Апошнія навіны па праблеме гаварыць аб тым, што пэўны плён выступленне таксістаў займела — днямі старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац даручыў правесці праверку ў дачыненні да працы Uber і азнаёміць з вынікамі работнікаў сферы. Таму ў хуткім часе адказ на пытанне аб правамоцнасці існавання сэрвісу ў Беларусі будзе атрыманы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Ну і ну!

ЗАКАЗАЎ ЗАБІЦЬ БЫЛУЮ ЖОНКУ ЗА 500 ДОЛАРАЎ

Супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Беларусі прадухілілі забойства.

Як паведамляе **Сяргей ШАРШАНЕВІЧ, афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці**, 24-гадовы жыхар гарадскога пасёлка Бярозаўка, што ў Лідскім раёне, у перыяд з чэрвеня 2015 да лютага 2016, каб пазбавіць жыцця былую 37-гадовую жонку, за ўзнагароджанне наняў чалавека. У выглядзе задатку ён перадаў меркаванаму выканаўцу 100 долараў.

Падазраваны затрыманы па ўзніклым падазрэнні ў здзяйсненні злачынства. Па факце падрыхтоўкі да забойства па найме ўпраўленнем Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці заведзена крымінальная справа. Матывы, якія падштурхнулі мужчыну на злачынства, установяць падчас далейшага расследавання.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 лютага 2016 г.
№ 3 (366)

У АБАРОТ!

ПАРАДАК

ПАЛЯПШАЕ НАСТРОЙ

Больш як 1,2 тысячы га зямлі было перададзена летась у Нараўлянскім раёне лесагаспадарчым і сельскагаспадарчым прадпрыемствам

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Адкуль такое багацце? Участкі выслабаніліся ў выніку паслядоўнай работы па зносе пустуючых домаўладальніцтваў. Старшыня раённага Савета дэпутатаў Ала НАВУМЕНКА расказвае, што праблема гэта насамрэч няпростая. Зямельныя ўчасткі, якія не маюць сапраўдных гаспадароў, прыходзяць у заняпад: зарастаюць пустазеллем і кустоўем.

— Запатрабаванасці яны не маюць, бо знаходзяцца ў неперспектыўных населеных пунктах. Але ж за працэдурай зносу кожнага дома стаіць вялікая работа. Перш чым нешта зрабіць з такой закінутай хатай, мы збіраем вялікі пакет дакументаў і перадаём яго для разгляду ў суд. Таму ўсе знесеныя хаты прайшлі праз рашэнне суда.

Ала Навуменка падкрэслівае, што сёння ўсім грамадзянам зразумела: праца па навядзенні парадку на зямлі — гэта не часовая кампанія, не разавая акцыя. Вяртанне зямлі ў гаспадарчы абарот прыводзіць да паляпшэння эканомікі ўсяго раёна. Ды і настрой людзей, якія пражываюць у дагледжаных добраўпарадкаваных населеных пунктах, становіцца больш пазітыўным.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

НАШ ДОМ

КАБ МЫ ТАК ЖЫЛІ!..

Фота Святланы НІКАЛАЕВАЙ.

Старшая па пад'ездзе Антаніна НАДОЛЬСКАЯ.

Нездарма людзі кажуць: «Мой дом, мая — крэпасць». Не моцныя замкі на дзвярах перш за ўсё маюцца тут на ўвазе, а ўтульнасць, парадак і чысціня. Не толькі ў кватэрах, але і ў месцах агульнага карыстання.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Да нядаўняга часу жыхары дома 26а, што на вуліцы Гагарына ў Жодзіне, адчувалі сябе не вельмі камфортна. Уваходныя дзверы амаль разламаныя, у пад'езд мог свабодна зайсці чужы чалавек. У тым ліку асобы без пэўнага месца жыхарства. У выніку — размаляваныя, пашарпаныя сцены і кабіна ліфта, непрыемныя пахі...

— Усё, хопіць так жыць, — сказала старшая па пад'ездзе, жыхарка адной з кватэр Антаніна Надольская.

І ў літаральным сэнсе пайшла па кватэрах. Напачатку сабралі грошы на ўстаноўку дамафона і дзвюх відэакамер. У пад'ездзе стала ціха — жыльцы ўздыхнулі спакойна.

Але Антаніна Мікалаеўна, чалавек актыўны і нераўнадушны, на гэтым не спынілася:

— Давайце скінемся яшчэ і на рамонт пад'езда. Дому ж амаль 40 гадоў!

На той час кошт пытання быў — 600 тыс. рублёў з кожнай кватэры. Здавалася б, не такія ўжо і значныя выдаткі. Але ў пад'ездзе жывуць у тым ліку і людзі з невялікім дастаткам, шмат пенсіянераў. Многія спасылаліся на тое, што кожны месяц плацяць за тэхнічнае абслугоўванне і капітальны рамонт: няхай, маўляў, камунальнікі і наводзяць парадак. Даводзілася кожнага, хто не згаджаўся, угаворваць, пераконваць.

> На той час кошт пытання быў — 600 тыс. рублёў з кожнай кватэры. Здавалася б, не такія ўжо і значныя выдаткі. Але ў пад'ездзе жывуць і людзі з невялікім дастаткам, пенсіянеры.

— Няўжо вам не надакучыла жыць у брудзе, няўжо не хочацца прыгажосці, утульнасці? А хто ж іх створыць, як не мы самі? — зноў і зноў звярталася Антаніна Мікалаеўна да ўладальнікаў кватэр.

Як кажуць, і кропля камень точыць... Тым больш што і камунальнікі пайшлі насустрач жыльцам: уключылі суму ў жыроўку з растэрміноўкай плацяжу на 6 месяцаў.

Неабходныя матэрыялы і фарбу купілі на свой выбар, па сваім густе. Ну, а работнікі і спецыялісты жыллёва-камунальнай гаспадаркі па дамове займаліся рамонтам пад наглядам старшай па пад'ездзе. Пафарбавалі сцены, столь, паклалі плітку, замянілі электраправодку.

Але адна справа зрабіць рамонт, іншая — падтрымліваць штодзённы парадак і чысціню. «Ці не так?» — звяртаюся да Антаніны Мікалаеўны.

— Прыбіральшчыца прыходзіць не так часта — па графіку. Цяпер, відаць, адмовімся ад яе паслуг. Жыльцы і самі ў стане вымыць свае лесвічныя пляцоўкі. Гэта танней абыдзецца, — адказвае яна.

Сапраўды, пад'езд не толькі блішчыць чысцінёй. На кожным паверсе — карціны, жывыя кветкі.

— Сваю пляцоўку ўпрыгожваюць самі ўладальнікі кватэр, а іх на адным паверсе — 4. Збіраюцца разам і вырашаюць, што купіць у залежнасці ад магчымасцяў і густаў, — перахоплівае мой погляд Антаніна Надольская.

Тыя, хто не згаджаўся паўдзельнічаць у рамонце долевым спосабам, цяпер задаволены канчатковым вынікам.

— Супраць каманды яны бяссільныя, вымушаны падпарадкавацца агульнаму рашэнню, — лічыць мая суразмоўца. — У перспектыве плануем перарабіць ганак пры ўваходзе ў пад'езд, добраўпарадкаваць дваровую тэрыторыю, зрабіць дзіцячыя пляцоўкі, расшырыць дарогу, уладкаваць стаянку для транспарту, тратуарныя дарожкі.

— Зноў за ўласныя сродкі? — пацікавілася ў Антаніны Мікалаеўны.

— Пакуль думаем. Калі мэр горада і дырэктар ЖКГ часткова дапамогуць, то будзем ім вельмі ўдзячны.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

СПАРТЫЎНЫ КОМПЛЕКС І ПЕРАХОД ЦЕРАЗ ШАШУ

Калі патрэбен дэпутацкі кантроль?

Дэпутат ад Бярэзінскай выбарчай акругі №41 Віктар ШЧЭЦЬКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы, вылучае ў сваёй працы два вялікія кірункі: гэта заканатворчая работа і праца непасрэдна з выбаршчыкамі. Па яго прызнанні, часам звароты становяцца ні многа ні мала — падставай для карэкціроўкі пэўных нарматыўных актаў. Але пра ўсё па парадку.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Роля дэпутата — гэта праца з заканадаўствам: яго ўдасканаленне, прыняцце новых заканадаўчых актаў, — дзеліцца сваімі разважаннямі Віктар Уладзіміравіч. — Але не менш важным кірункам з'яўляецца і праца з людзьмі. Апошняя павінна ўлічвацца пры прыняцці пэўных рашэнняў, заканадаўчых актаў.

Акруга ў майго суразмоўцы вялікая — уключае ажно тры раёны: Бярэзінскі, Крупскі і Чэрвеньскі.

— Мая тэрыторыя — «расцягнутая», аб'ядноўвае сельскагаспадарчыя раёны, — расказвае дэпутат. — Гэта не тое, што ў цябе адзін горад, і ўмомант можна дабрацца ў патрэбнае месца. Але спраўляюся, калі што — дамаўляюся па тэлефоне.

З улікам таго, што да выбаршчыкаў дабрацца не заўсёды проста, Віктар Уладзіміравіч на працягу сваёй дэпутацкай працы выкарыстоўваў розныя, так сказаць, методыкі працы з людзьмі.

— Практыкаваў прыём грамадзян у кожным раёне кожны месяц, потым некаторы час праводзіў адначасова і прыём грамадзян, і «прамую лінію» — каб маглі дазваніцца і людзі з іншых раёнаў, што ўваходзяць у маю акругу. Апошні год часцей выязджаю ў сельсаветы і там сустракаюся з выбаршчыкамі — сапраўды, так людзей прыходзіць больш.

Парламент — добрая школа

У гэтым годзе — парламенцкія выбары. Пытаюся ў Віктара Уладзіміравіча пра ўражанні ад дэпутацкай працы.

— Гэта добрая школа для чалавека любога ўзросту, — не задумваючыся кажа ён, — гэта магчымасць зразумець знутры, як працуюць дзяржаўныя органы, як пішуцца законы. Хтосьці з дэпутатаў ужо мае «багаж ведаў», нехта вучыцца адразу на практыцы...

Што да зваротаў, з якімі прыходзілі выбаршчыкі, то яны, па словах суразмоўцы, самыя разнастайныя. Гэта і праблемы з ЖКГ, і будаўніцтва вялікіх інфраструктурных аб'ектаў, і добраўпарадкаванне, і прыватызацыя дамоў...

— Былі пытанні, калі людзі не маглі прыватызаваць жыллё. Звярнуліся жыхары вёскі, што ў Крупскім раёне, — іх дамы нават не стаялі на балансе, таму іх нельга было прыватызаваць: не было ні пашпарта аб'екта, ні іншых дакументаў. Звярнуўся ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, і яно адрэагавала. У выніку быў падрыхтаваны і выдадзены адпаведны указ, і людзі змаглі вырашыць сваю праблему.

Некаторы час назад у акрузе дэпутата Віктара Шчэцькі амаль адначасова пачалося будаўніцтва двух вялікіх фізкультурна-спартыўных аб'ектаў — у Чэрвеньскім і Бярэзінскім раёнах.

— Але калі ў Бярэзінскім раёне ўлады адрэагавалі як належыць: выкарысталі выдзеленыя на будаўніцтва сродкі і своечасова ўвялі аб'ект у эксплуатацыю, то ў Чэрвені з гэтым зацягнулі. Былі прэтэнзіі да ўладаў, праблемы з недахопам грашовых сродкаў — дапамагаў шукаць дадатковыя крыніцы фінансавання... Але ў выніку ўсё пабудавалі.

Узнікалі праблемы і падчас вельмі добрай і карыснай па сутнасці сваёй справы — калі будавалі трасу Мінск—Магілёў.

— Чатыры гады таму Беразіно амаль цалкам быў перакапаны падчас будаўніцтва шашы Мінск—Магілёў. Але мы паабяцалі людзям вырашыць гэтую праблему, і абяцанне выканалі. Сёння, я лічу, Беразіно выглядае як вельмі годны горад. У гэтым заслуга, натуральна, тагачаснага губернатара Барыса Батуры.

Як перабрацца на другі бок?

Часам звароты людзей, нават калі яны абгрунтаваныя, выканаць складана.

— Дагэтуль не выкананы зварот жыхароў вёскі Заполле Чэрвеньскага раёна. Праз іх населены пункт пралягае тая ж шаша Мінск—Магілёў. Там зрабілі верхавы мост, які праходзіць над трасай. Але як перайсці яго маці з каляской? Натуральна, і дзеці ідуць у школу, ім таксама гэта нязручна і небяспечна... Тры разы сустракаўся з дырэктарам абласнога Аўтадара. Пазней як даверaная асоба Прэзідэнта да вырашэння гэтай праблемы далучыўся Віктар Гумінскі.

Але падземны пераход рабіць — гэта дорага. У той жа час у некаторых вёсках, што знаходзяцца далей, паабапал гэтай шашы, паставілі святлафоры, устанавілі знакі, каб кіроўцы загадзя зніжалі хуткасць.

— Людзі гэта бачаць і пытаюць: чаму ў суседзяў так можна было зрабіць, а ў іх вёсцы — не? Адказу няма, таму што, сапраўды, жаданне людзей абгрунтаванае і справядлівае. Я таксама настойваў, каб зрабілі так, як у суседніх вёсках. Але ўсё гэта цягнецца ўжо больш за год...

Агульнае і прыватнае

Звароты бываюць адразу ад жыхароў цэлай вёскі або ад некалькіх людзей, а бывае, што чалавек прыходзіць з нейкай асабістай праблемай.

— Даводзілася дапамагаць пажылому чалавеку атрымаць інвалідную каляску на акумулятары — сам ён з пасёлка Паплавы, што пад Беразіно, — узгадвае Віктар Уладзіміравіч. — Чалавек — інвалід, але вельмі жвавы, актыўны, піша вершы, і прытым добрыя.

Дэпутат вельмі рады, што атрымалася дапамагчы такому цікаваму чалавеку.

Зусім нядаўна былі ўнесены папраўкі ў Закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», дзе сярод іншага прадугледжваецца грашовае пакаранне тым, хто неабгрунтавана зноў і зноў звяртаецца ў розныя інстанцыі па адным і тым жа пытанні — калі, здавалася б, усё ўжо патлумачана. Пытаюся ў парламентарыя, ці шмат «прафесійных» скаржнікаў у яго акрузе.

— Яны ёсць у кожным раёне. Калі да мяне прыходзіць такі чалавек, то стараюся яму ўсё акуратна патлумачыць. Часам ён злуецца, але што зробіш. Калі чалавек прайшоў усе суды — што я магу яму сказаць дадаткова? У цэлым жа такіх зваротаў — меншасць. Часам звароты я не афармляю, а вырашаю ўсё адразу, — расказвае дэпутат. — Вельмі ўдзячны за дапамогу старшыням райвыканкамаў — яны малайцы. Рэагуюць своечасова, калі ёсць час — удзельнічаюць самі ў прыёмах грамадзян. Працуем прадуктыўна і, натуральна, у межах заканадаўчых актаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ПА ТОЙ БОК ПРЫЛАЎКА

ПРАТЭРМІНОЎКА, НЕДАЎКЛАДАННІ, ПАДМАН ПАКУПНІКОЎ

Што адбываецца з гандлем у Салігорску?

Міністэрства гандлю, улічваючы інфармацыю, якая паступіла ад праваахоўных органаў, надало пільную ўвагу рабоце аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання Салігорска.

У выніку, як паведамляе прэс-служба міністэрства, установлена, што ў 83 працэнтах аб'ектаў ад колькасці праверaных рэалізоўвалася пратэрмінаваная кулінарная і малочная (у тым ліку прызначаная для дзяцей) прадукцыя, каўбасныя, мясныя, хлебабулачныя вырабы і іншае. Больш за тое, кожным з праверaных аб'ектаў не захоўваўся зацверджаны абавязковы асартыментны пералік тавараў. Таксама ўстаноўлены факты прадастаўлення недакладнай інфармацыі пра тавар, парушэння парадку афармлення цэннікаў, выкарыстання непаверанага вагавымяральнага абсталявання, падману пакупнікоў. Напрыклад, у міні-кавярні «Лінгандаль» і кавярні «Элнур» недаўкладанні па асобных відах кулінарнай прадукцыі дасягалі 17 працэнтаў.

Па выніках праверак дзейнасць 12 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання прыпынена, на вінаватых асоб складзены пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях. Інфармацыя таксама накіравана ў Мінскі аблвыканкам для прыняцця неабходных мер рэагавання.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ТЭНДЭНЦЫЯ, АДНАК...

ТЭРАПЕЎТ ШЫРОКАГА ПРОФІЛЮ

Сельскі доктар — даўно ўрач агульнай практыкі, засталося канчаткова ўзаконіць статус

Святлана ЯСКЕВІЧ

Летась давялося пазнаёміцца з вясковым урачом агульнай практыкі Аленай ШУРХАЙ. Алена Пятроўна працуе ў амбулаторыі аграгарадка Відамля Камянецкага раёна. Старшыня сельскага Савета тады расказала не зусім звычайную гісторыю замацавання спецыяліста ў гэтай вёсцы. Раней тут часта мяняліся дактары: прыедзе чалавек па размеркаванні, адпрацуе належныя два гады і кіруецца ў горад. Алену Шурхай таксама перавялі з іншай амбулаторыі, каб часова закрыць кадравую «брэш» — сказалі, пакуль знойдуць спецыяліста.

Доктар узялася за работу і адразу паказала сябе як уважлівы чалавек і знаўца сваёй справы. Але ж усе ведалі, што яна ў вёсцы часова. Тады сабралася ініцыятыўная група вяскоўцаў, найбольш з жанчын, і пайшла да кіраўніка сельгаспрадпрыемства. Дэлегацыя агучыла просьбу — выдзеліць кватэру сям'і медыкаў (муж доктара Алены працуе на хуткай дапамозе ў райцэнтры). Пытанне вынеслі на разгляд назіральнага савета акцыянернага таварыства, і абсалютная большасць удзельнікаў сходу прагаласавала «за». У выніку прэцэдэнту вясковай дэмакратыі жыллёвае пытанне медыцынскага работніка вырашылася. І Алена Шурхай стала тым спецыялістам, якога раней прыгожа называлі земскім доктарам.

Урач агульнай практыкі Алена ШУРХАЙ — сапраўдны «земскі доктар».

У сваёй амбулаторыі яна — кіраўнік маленькага калектыву і ўрач агульнай практыкі. Зона абслугоўвання ўстановы — больш за дзве тысячы чалавек. У сезон пад'ёму вірусных захворванняў на прыём прыходзіць каля 40 пацыентаў у дзень. А трэба яшчэ праехаць па выкліках да хворых, правесці агляд і прафілактычную работу, апошняе асабліва датычыць маленькіх дзяцей.

Паводле слоў **галоўнага ўрача Камянецкай цэнтральнай раённай бальніцы Івана КРАСІНСКАГА,** у раёне восем урачэбных амбулаторый, і ва ўсіх працуюць дактары агульнай практыкі. Іван Іосіфавіч адзначае гэты факт як станоўчую тэндэнцыю ў развіцці аховы здароўя вясковага насельніцтва. Людзям з «глыбінкі», з аддаленых вёсак не трэба дабірацца ў райцэнтр з-за невялікай праблемы са здароўем. Большасць жа наведвальнікаў прыходзіць у паліклініку ці амбулаторыю са стандартнымі скаргамі: закалола ў баку, прастрэл у спіне, рэжа ў вачах, шуміць у вуху і гэтак далей. Дык вось з такімі і падобнымі сімптомамі мясцовы медык не будзе адразу пісаць накіраванне ў раён. Бо ўрач агульнай практыкі — тэрапеўт шырокага профілю — многае ведае і ўмее. На месцы правядзе нескладаныя маніпуляцыі з горлам і вухам, накладзе швы, дыягнастуе неўралагічныя праблемы і парэкамендуе лячэнне.

Больш за дзесяцігоддзе працуе ўрачом агульнай практыкі ў Радваніцкай амбулаторыі Брэсцкага раёна Святлана Іванчанка. Спачатку, як і многія яе калегі, Святлана Мікалаеўна была тэрапеўтам. У свой час прайшла чатырохмесячную спецыялізацыю ў Мінску, потым два гады вучылася ў вочна-завочнай клінічнай ардынатуры. Цяпер яе ўчастак складаецца з чатырох вёсак з насельніцтвам каля адной тысячы чалавек.

Больш за дзесяцігоддзе працуе ўрачом агульнай практыкі Святлана ІВАНЧАНКА *(злева)*.

> У Брэсцкай вобласці са 130 урачэбных амбулаторый 105 ужо функцыянуюць у рэжыме ўстаноў урача агульнай практыкі.

З ранку доктар вядзе прыём, робіць агляд і дае прызначэнні тым, хто лечыцца на дзённым стацыянары. Пасля абеду Святлана Мікалаеўна ездзіць па выкліках, і дзесьці а шаснаццатай гадзіне ўжо зноў у сваёй лячэбнай установе. Радваніцкая амбулаторыя адкрытая з 8 да 19 гадзін. Да ўказанага часу ва ўстанове ёсць медработнік, які заўсёды на сувязі з доктарам.

Цяпер, у сезон прастудных захворванняў, адзначае ўрач, найбольш і выклікаў, і наведванняў звязана з дзіцячымі хваробамі. Гэта катэгорыя пацыентаў найбольш адчувальная да вірусных інфекцый. Часцей хварэюць дзеці, якія наведваюць дзіцячыя калектывы, даводзіцца выпісваць ім лекі, прызначаць працэдуры, а таксама навучаць мам, як праводзіць прафілактыку.

Пажылыя людзі, асабліва адзінокія, з'яўляюцца асобным клопатам амбулаторыі. Урач наведвае іх дома па графіку. Некаторых вельмі складана ўгаварыць легчы на планавае лячэнне ў бальніцу. Тады выручае дзённы стацыянар. У лячэбнай установе ёсць тры ложкі, дзякуючы якім заўсёды можна правесці курс кропельніц, укалаў, зрабіць фізіяпрацэдуры.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

НЕ ЧАКАЦЬ ЗВАРОТАЎ, А СТАРАЦЦА ІХ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

Так лічыць старшыня Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў Канстанцін БЕРДНІКОВІЧ

Жыццё — гэта заўсёды нейкія праблемы, якія патрабуюць вырашэння. І хіба ж можна, па вялікім рахунку, паскардзіцца, што да надзённых пытанняў людзей бракуе ўвагі з боку тых ці іншых дзяржаўных структур? У рэгіёнах рэгулярна праводзяцца прыёмы грамадзян, увайшлі ў норму прамыя тэлефонныя лініі, у тым ліку і па суботах. Так і на Зэльвеншчыне. Праўда, апошнім часам у раёне заўважылі, што зваротаў становіцца ўсё менш. Вось якое меркаванне выказаў наконт гэтага старшыня Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў Канстанцін БЕРДНІКОВІЧ.

— Канстанцін Іванавіч, чаму зваротаў цяпер практычна адзінкі?

— Бо трэба, каб не людзі ішлі да ўлады, а работнікі ўладных структур ішлі ў народ. Каб ведаць існуючыя праблемы, недапрацоўкі і старацца прыняць адпаведныя меры. І тым самым папярэдзіць незадаволенасць людзей, скаргі ў раённыя і вышэйстаячыя інстанцыі.

Фота Аляксея ШУМОВІЧА.

Канстанцін БЕРДНІКОВІЧ віншуе з 90-гадовым юбілеем жыхара вёскі Горна, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Аркадзя ЖЫВУЛЬКУ.

Узяць, напрыклад, аглядныя камісіі ў сельсаветах. Калі яны існуюць фармальна, на паперы, то, зразумела, ніякага толку не будзе. Ды і каму гэта патрэбна? Аднак калі падыходзіць адказна, з жаданнем убачыць праблему і яе вырашыць, то гэта вельмі сур'ёзная і дзейсная справа. У нас ужо склаўся парадак, што раз на тыдзень аглядныя камісіі, куды ўваходзяць спецыялісты ўсіх зацікаўленых службаў, наведваюць домаўладанні жыхароў з так званай групы рызыкі, пажылых адзінокіх людзей і на свае вочы пераконваюцца, якія ў іх умовы пражывання. Дапамагаюць у вырашэнні бытавых пытанняў (электраправодка, ацяпленне і г. д.), уручаюць памяткі аб выкананні правілаў пажарнай бяспекі, выдаюць адпаведныя прадпісанні аб устараненні выяўленых парушэнняў. Бывае, пісьмова нагадваюць дзецям пра іх абавязак дапамагаць састарэлым бацькам. Гэта ж не проста пытанне сумлення, а канстытуцыйная норма.

— Камісійна заўважылі, адзначылі ў акце. А вынік?

— Вось гэта самае галоўнае. Зазначу, што тыя ці іншыя «балячкі» мы не проста бачым і фіксуем, а бяром на кантроль, рэгулярна разглядаем вынікі работы аглядных камісій у кожным сельсавеце на ўзроўні раённага выканаўчага камітэта. Каб не сурочыць, не буду прыводзіць нейкую статыстыку ў дачыненні да пажараў і іншых надзвычайных сітуацый, але, паверце, эфект ад такой сумеснай працы ўлады і актывістаў мясцовага самакіравання відавочны.

Дарэчы, многія скаргі таксама папярэджваюцца дзякуючы сустрэчам з вяскоўцамі членаў раённых інфармацыйных груп, а таксама сельскім сходам. Вельмі актыўна ўзаемадзейнічаем са старастамі вёсак. Яны цесна кантактуюць з кіраўнікамі сельскіх Саветаў, удзельнічаюць у рабоце сесій, а многія старасты яшчэ і дэпутаты.

— А ці не з'яўляецца ў чалавека звычка да ўтрыманства, калі ён і пальцам сам не паварушыць, а толькі спадзяецца на ўладу?

— Безумоўна, святая справа ўлады — дапамагчы людзям, якім без гэтай падтрымкі сапраўды не абысціся — нядужым, пажылым, адзінокім грамадзянам. А іншым трэба, як кажуць, і самім не спаць у шапку. На мой погляд, такое разуменне паступова ўсё ж адбываецца. Раней нярэдка прыходзілі ў орган улады і патрабавалі «нешта даць». А цяпер больш просяць дапамагчы — прычым не сабе асабіста, а ў рэчышчы грамадскага інтарэсу. Напрыклад, як заасфальтаваць вуліцу? Пытанне ж не прыватнае, яно хвалюе і іншых жыхароў. У падобных выпадках, вядома, імгненнага рашэння не бывае, бо яны звязаны з грашовымі сродкамі, але і безнадзейнасці няма. Напрыклад, асноўныя дарожныя непрыемнасці ў Зэльве за апошнія гады ўсё ж устаранілі. І гэтую работу райвыканкам прадоўжыць.

Хаця ёсць і звароты па прыватных пытаннях — як правіла, кансультатыўнага характару. Нядаўна, напрыклад, жыхарка адной з вёсак звярнулася да мяне наконт дома, які ў свой час купляўся пад субсідыю для шматдзетнай сям'і. Яна хоча афарміць яго на дзяцей, патрэбна згода былога мужа, які цяпер недзе ў Расіі, але дзе дакладна — невядома... Пастараемся гэтай жанчыне дапамагчы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

Зэльвенскі раён.

СВАЕ СЯРОД СВАІХ

НАШ РАХІМ

Як хлопец з далёкага Узбекістана стаў жыхаром пружанскай вёскі, а потым — яе старастам

У невялікім узбекскім гарадку, каля самага Самарканда, амаль паўвека таму ў сям'і Намазавых нарадзіўся хлопчык. Паводле дакументаў яго запісалі Жаўкон, але маці больш падабалася імя Рахім — так яго і сталі называць з лёгкай рукі матулі. Хто б мог падумаць, што Рахім стане жыхаром беларускай вёскі, нават яе старастам, і ўсе аднавяскоўцы ў Бакунах будуць яго паважаць і называць «наш Рахім»?

Пад Самаркандам у яго быў свой дом са светлай тэрасай і вялікім вінаградні-кам. Паводле тамтэйшага звычаю, бацька ўзводзіць дамы для кожнага з сыноў. У іх сям'і ўсяго восем дзяцей — чатыры браты і чатыры сястры. Так што бацька Рахіма з дапамогай сыноў пабудаваў чатыры дамы. Браты справілі навасэлле, а Рахімаў дом стаяў без гаспадара. І 23 гады таму яны з жонкай пачалі пераезд ва Узбекістан. Пачаць-пачалі, ды не закончылі, бо не лёс...

...Пасля заканчэння школы і сельскагаспадарчага тэхнікума Рахім Намазаў быў прызваны ў армію. Служыць трапіў пад Пружаны, у пасёлак Засімавічы. Тут і сустрэў мілавідную ўкраінку Святлану. Яна спачатку працавала ў родным Луцку на заводзе. А потым сяброўка выцягнула на Пружаншчыну. Таксама лёс. Такім чынам у пружанскай вёсцы ўтварылася новая інтэрнацыянальная сям'я, як аказалася, шчаслівая. Працавалі муж з жонкай у калгасе жывёлаводамі. Атрымалі ў Бакунах спачатку пакой ў інтэрнаце, потым кватэру ў двухкватэрным доме. У савецкія часы кожны год ляталі на радзіму мужа.

— Білет ад Мінска да Ташкента каштаваў 60 рублёў, — згадвае Рахім. — Цяпер прамога самалёта няма, трэба дабірацца праз Маскву. Апошні раз, як наведвалі радню, паездка для аднаго ў адзін бок абышлася прыкладна ў 1000 долараў.

Калі з распадам Саюза выбірацца на радзіму стала ўсё цяжэй, задумаў галава сям'і вярнуцца ў свой дом, які доўга яго чакаў, назаўсёды. У 1993 годзе быў заказаны кантэйнер, і ўсе хатнія пажыткі вагой у тры тоны адправілі чыгункай у Самарканд. Пераехаў і Рахім. Святлана з малодшым сынам павінны былі прыехаць крыху пазней, калі муж усё падрыхтуе да іх прыезду. І раптам яна захварэла, трапіла ў бальніцу. Праблема аказалася сур'ёзнай, месяц-другі ўрачы забаранілі ёй рухацца.

Святлана і Рахім НАМАЗАВЫ.

Цяпер Святлана Іванаўна гаворыць, што так, відаць, трэба было. Рахім не змог доўга чакаць — узяў білет і вярнуўся ў Беларусь. Цяпер яны нікольі не шкадуюць, што так склалася. Мінулі 90-я, жыццё наладзілася. Святлана і Рахім працавалі на ферме. Падраслі два сыны і дачка.

Цяпер усе дзеці на сваім хлебе, усе працуюць. Але ж, вядома, бацькі ўсім дапамагаюць. Дачка Наргіза стварыла сям'ю першай і парадавала бацькоў унукамі. Нядаўна і малодшы сын прадставіў бацькам нявесту. Ну а старэйшы пасля ўніверсітэта заняты вытворчымі клопатамі ды кар'ерным ростам, сям'я — у яго пазнейшых планах.

У гаспадарцы Намазавы заўсёды былі ў ліку найлепшых. Абое шмат гадоў працуюць на ферме тэхнікамі-асемянатарамі. Рахім па спецыяльнасці заатэхнік, за столькі гадоў работы вывучыў і тонкасці ветэрынарыі. Ва ўсёй акрузе ведаюць яго як знаўцу свойскай жывёлы. Усе клічуць, як прыхварэе свінка альбо карова целіцца, і патрэбная кваліфікаваная дапамога. Не было выпадку, каб Рахім некаму адмовіў. Таму і ведаюць яго ў навакольных вёсках, нават у аддаленых.

У гэтай сувязі аднойчы здарыўся канфуз на выбарах у мясцовыя Саветы, які Святлана цяпер згадала са смехам. Яна тады была членам участковай камісіі. А па Бакунах у сельскі Савет выбіралі яе мужа. Прыйшла на ўчастак бабулька з іншай вёскі, атрымала бюлетэнь і спытала, дзе тут паставіць адзнаку, каб прагаласаваць за Рахіма. Ёй сталі тлумачыць, што па яе вёсцы вылучаны іншы кандыдат. Але выбаршчыца стаяла на сваім: «Я прыйшла галасаваць за Рахіма!».

Таму не даводзіцца здзіўляцца, што ўзбека Намазава жыхары беларускіх Бакуноў абралі сваім старастам. Многія грамадскія справы робяцца цяпер у дварэ Намазавых. Тут людзі збіраліся, напрыклад, каб вырашыць пытанне наконт пакупкі электрапастуха. Сабралі грошы, купілі. Цяпер, як той казаў, гора не ведаюць. Але любое электраабсталяванне, як вядома, патрабуе догляду. Менавіта Святлана сочыць за тым, каб у запасе былі элементы сілкавання да таго «пастуха». «Яшчэ ў мяне 105 тысяч рублёў ляжыць на батарэйкі, — кажа яна, — і ўсе гаспадары кароў гэта ведаюць». З фінансамі — поўная празрыстасць.

І хоць старастам з'яўляецца Рахім, усю грамадскую работу яны робяць удваіх. Гэта і веснавая альбо асенняя ўборка вёскі: вуліц і асноўных грамадскіх месцаў. І асаблівы клопат пра могілкі, якія знаходзяцца ў Радзецку. Вось і цяпер працягваецца збор сродкаў на рамонт капліцы. Дарэчы, сама вёска Радзецк маленькая, засталося ў ёй менш за два дзясяткі чалавек. Там нічога няма з сацыяльных аб'ектаў, толькі аўталаўка прыязджае. Таму сёлета жыхары Бакуноў вырашылі павіншаваць суседзяў на калядныя святы. Сабраліся ўдзельнікі самадзейнасці на чале са Святланай, запрэглі каня і паехалі калядаваць. «Ой, як яны былі рады! — расказвае Святлана Іванаўна, — запрашалі ў хату, прасілі прыязджаць яшчэ. Мы зразумелі, што трэба часцей ладзіць такія выезды, каб падтрымаць людзей з маленькай аддаленай вёскі».

Старасту паважаюць яшчэ і таму, што ён можа не толькі арганізаваць, але і многае робіць сам. Ну вось, вырашылі грамадой, што крыж павінен быць не толькі ў цэнтры вёскі, але і на ўездзе. Рахім з суседам самі зрабілі той крыж і ўстанавілі. А жанчыны ўжо даглядаюць, упрыгожваюць.

— Добра жывём, дружна, — гаворыць Рахім Намазаў.

А ў тым, што ў Бакунах дружныя і добразычлівыя людзі, удалося ўпэўніцца самой. Калі мы завіталі да Намазавых, яны толькі вярнуліся з фермы. Тут жа забегла суседка, якая жыве праз дарогу, і паведаміла: «Я вашу карову пакарміла, бо яна голас падавала».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Пружанскі раён.

ПАРАДАК ПАЛЯПШАЕ НАСТРОЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дадаткова для навядзення санітарнага парадку на зямлі раённым Саветам дэпутатаў сумесна з райвыканкамам аб'яўляюцца і праводзяцца месячнікі і суботнікі па добраўпарадкаванні тэрыторый.

— У выніку сумеснай працы на тэрыторыі горада, сельскіх населеных пунктаў праводзіліся работы па ўстаноўцы новых агароджаў, дэмантажы трухлявых і старых платоў, высечцы дзікарослых хмызнякоў, выдаленні аварыйных дрэў, афарбоўцы агароджаў, усталяванні малых архітэктурных формаў і дзіцячых гульнявых пляцовак, — гаворыць Ала Навуменка.

Вельмі важная роля ў работах па добраўпарадкаванні належыць жыхарам, у тым ліку ў сумесным фінансаванні. У адпаведнасці з Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» на тэрыторыі сельсаветаў Нараўлянскага раёна быў вызначаны дакладны парадак збору сродкаў па артыкуле самаабкладання. Жыхары не толькі сабралі грошы, але і прымалі актыўны ўдзел у работах па добраўпарадкаванні могілак. Дарэчы, менавіта на гэтыя мэты і былі накіраваны сродкі.

Да таго ж, летась у раёне змаглі вызначыць лёс шасці аварыйных будынкаў, якія не эксплуатаваліся, але знаходзіліся на балансе прадпрыемстваў і арганізацый. Чатыры з іх былі прададзены, а два ўвогуле знесены. Праведзены работы па прывядзенні ў належны санітарны і тэхнічны стан міні-палігонаў цвёрдых камунальных побытавых адходаў.

iost@zviazda.by

КАБ МЫ ТАК ЖЫЛІ!..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Ды і жыхары іншых пад'ездаў павінны далучыцца да ўладкавання тэрыторыі пры доме. Яна ж агульная для ўсіх, тут яны пакідаюць свае машыны, тут гуляюць іх дзеці... Спрабавала з імі гутарыць, але палова не пагаджаецца. Маўляў, дорага, — такі вынік папярэдняй работы. Але ўсё ж спадзяюся, што намечанае зробім.

Як тут не згадаць словы Маленькага прынца з аднайменнай аповесці французскага пісьменніка Антуана дэ Сент-Экзюперы: «Ёсць такое цвёрдае правіла. Устаў раніцой, памыўся, прывёў сябе ў парадак — і адразу ж прывядзі ў парадак сваю планету». Сапраўды, хто калі не мы самі, навядзе парадак у сваёй кватэры, доме, пад'ездзе, падворку, у сваім горадзе.

lazovskaya@zviazda.by

Іван ДРОЗД, дырэктар аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі г. Жодзіна:

— У многіх жыхароў пакуль пераважае спажывецкі прынцып: нехта павінен адрамантаваць ім пад'езд, кватэру: мясцовыя ўлады, камунальнікі. Мы імкнёмся знайсці ўзаемаразуменне з кожным жыхаром, «пераламаць» свядомасць: за парадак там, дзе жывеш, павінен адказваць сам. І зрухі ёсць. У гэтым годзе адрамантавалі 117 пад'ездаў за кошт усіх крыніц фінансавання, у тым ліку і з долевым удзелам саміх жыхароў.

ТЭРАПЕЎТ ШЫРОКАГА ПРОФІЛЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Несумненна, з пераводам тэрапеўта ў статус урача агульнай практыкі стала больш зручна будучым мамам. Пасля пастаноўкі на ўлік ва ўчастковага гінеколага ў горадзе, яны назіраюцца па месцы жыхарства, да профільнага спецыяліста едуць толькі раз на месяц. Што ўжо гаварыць пра тое, што простыя аналізы, электракардыяграму стала магчыма прайсці ў сваёй вёсцы, і не трэба выбірацца па кожным выпадку ў горад.

Яшчэ доктар агульнай практыкі працуе як сямейны, бо лечыць, як правіла, некалькі пакаленняў, ведае сямейныя захворванні і праблемы. Гэтую асаблівасць працы вясковага медыка ў размове з карэспандэнтам падкрэсліў **намеснік галоўнага ўрача Жабінкаўскай раённай бальніцы Іосіф АРЛАВЕЦ.** На жаль, даводзіцца займацца і складанымі сітуацыямі — наведваць тых грамадзян, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, кантраляваць выкананне дарослымі бацькоўскіх абавязкаў.

У Жабінкаўскім раёне функцыянуе пяць амбулаторый. Тры з іх ужо працуюць як участкі ўрачоў агульнай практыкі. Дзве плануецца перавесці ў названы статус да канца года. Іосіф Арлавец лічыць, што і ў райцэнтры трэба ўкараняць падобную практыку, калі ўчастковы доктар з сярэднім медыцынскім персаналам будуць працаваць па месцы жыхарства пацыентаў па прынцыпе амбулаторыі.

Варта адзначыць, што ў Брэсцкай вобласці працэс забеспячэння ўрачамі новага статусу ў сельскай мясцовасці выходзіць на завяршальную стадыю. Як паведаміў **галоўны тэрапеўт абласнога ўпраўлення аховы здароўя Леанід ГОРБІЧ,** са 130 урачэбных амбулаторый вобласці 105 ужо функцыянуюць у рэжыме ўстаноў урача агульнай практыкі. Астатнія павінны займець такі статус на працягу двух гадоў.

Жыццё паказала правільнасць такога курсу. Па-першае, разгружаюцца вузкія спецыялісты ў раённых паліклініках, якіх вельмі часта не хапае. А па-другое, з пераводам у новы статус вядзецца далейшае аснашчэнне вясковых медыцынскіх устаноў. І калі з асобнымі прыборамі, абсталяваннем яшчэ ёсць некаторыя праблемы, то транспарт для выездаў па выкліках маюць практычна ўсе амбулаторыі.

> “Урач з глыбінкі па сутнасці заўсёды быў урачом агульнай практыкі, і цяперашняя кампанія толькі канчаткова ўзаконіць яго статус.

Апошняе надзвычай важна, асабліва для той мясцовасці, дзе ёсць аддаленыя вёскі. Не так даўно ў гутарцы з нашым карэспандэнтам **старшыня Столінскага раённага Савета дэпутатаў Аляксей ДЗЯМКО** сказаў пра сельскіх медыкаў літаральна так: «Колькі жыццяў яны ратуюць!». Яно і зразумела — урачы знаходзяцца на першых рубяжах аховы здароўя. Нават своечасова зроблены ўкол пры павышаным ціску часта становіцца той самай ратавальнай саломінкай. Урач з глыбінкі па сутнасці заўсёды быў урачом агульнай практыкі, і цяперашняя кампанія толькі канчаткова ўзаконіць яго статус. А займацца яму даводзілася заўсёды, напрыклад, і хірургічнай дапамогай пры траўмах, і самымі рознымі маніпуляцыямі вузкіх спецыялістаў. Бо ў сельскай лякарні — як у шпіталі хуткай дапамогі: часта мала часу застаецца на роздум. Вось, напрыклад, у Хатынічах Ганцавіцкага раёна працуе ўчастковы педыятр Галіна Мінец. Галіна Іванаўна неяк расказвала, як прымала роды ў адной, мякка кажучы, не вельмі дысцыплінаванай маці. Электрычнасць у хаце была адключаная за даўгі. А калі ноччу пачаліся роды, тая жанчына пазваніла доктару. Галіну Іванаўну па ўказаным адрасе прывёз яе муж, урач участковай бальніцы, ён жа фарамі машыны забяспечваў асвятленне, пакуль жонка дапамагала парадзісе.

* * *

Як расказваюць старэйшыя медыкі, аказваецца, яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя ў Савецкім Саюзе былі спробы стварыць інстытут урача агульнай практыкі альбо сямейнага ўрача. А на пачатку 90-х яго ўвялі ў наменклатуру спецыяльнасцяў. Па сутнасці ён адпавядаў урачу хуткай і неадкладнай дапамогі і прыёмнага аддзялення. Пазней у адным з беларускіх медуніверсітэтаў пачалі рыхтаваць студэнтаў па гэтай праграме. Але з распадам краіны гэтая справа, як і многія іншыя, не атрымала працягу.

Яе час наступіў праз дзясяцігоддзі. Цяпер ёсць іншая сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў. З'явіліся амбулаторыі, падобныя на міні-паліклінікі, што вельмі зручна як для дзяцей, так і для ўзроставага сельскага насельніцтва.

yackevich@zviazda.by

ДРОБЯЗЬ, А ПРЫЕМНА

НЕЧАКАНАЯ ПАДЗЯКА... КАМУНАЛЬНІКАМ

Падчас «прамых ліній», якія рэгулярна праводзяцца ў аблвыканкамах і райвыканкамах, амаль ва ўсіх выпадках заяўнікі або скардзяцца, або нешта просяць. А вось дзякуюць, на жаль, рэдка. Тым больш — эмацыянальна, не шкадуючы шчырых слоў. Званок заяўніка, які выказаў уладам падзяку, стаў нечаканасцю для ўсіх.

Мужчына з райцэнтра Чашнікі патэлефанаваў на «прамую лінію» аднаму з намеснікаў старшыні Віцебскага аблвыканкама. Сказаў, што дзякуе камунальнікам за цяпло ў кватэры. Адзначыў, што ў свой час да вырашэння праблемы ацяплення яны аднесліся, як кажуць, па-людску.

За што менавіта мужчына выказаў падзяку?

— Да нас гэты чалавек не звяртаўся — усе звароты ў выканкам пад пільным кантролем. Але прыемна, калі грамадзянін на абласным узроўні вертыкалі ўлады дзякуе райннай ЖКГ «за добрасумленнасць і старанне», — адказала **кіраўнік справамі Чашніцкага райвыканкама Таццяна ЛЯГОЦІНА.**

У арганізацыі ЖКГ Чашніцкага раёна здзівіліся «нетыповаму» інтарэсу прадстаўніка рэспубліканскай газеты. Сціпла адзначылі, што «нічога такога глабальнага», каб чалавек быў настолькі ўдзячны, не зрабілі. Проста вырашылі праблему, можна сказаць, у рабочым парадку. Падкрэслілі, што гэта ж і ёсць работа і клопат падраздзялення сістэмы ЖКГ.

Яшчэ больш званку журналіста здзівіўся спецыяліст, які ў курсе ўсіх нюансаў.

— Дрэнна працавала сістэма ацяплення ў доме. Заяўнік распавядаў, што ў кватэры было вельмі холадна. Паводле яго слоў, часам месцамі нават іней праступаў на сценах. Калі не памыляюся, у яго вуглавая 2-пакаёвая кватэра ў 5-павярховым доме. Толькі мінулай зімой мы пачалі абслугоўваць будынак. А раней, як гаварылі ў савецкі час, дом быў «кааператыўны»... Адразу пасля звароту мы на месцы пачалі разбірацца. Гэта ж нашы абавязкі. На працягу прыкладна двух тыдняў ці трохі больш зрабілі ўсё, што было неабходна, — сціпла распавёў Аляксандр РУДЗЯНОК, майстар па тэхнічным абслугоўванні і рамонце ўнутрыдамавых інжынерных сістэм ЖКГ г. Чашнікі. (Усяго абслугоўваецца каля 110 дамоў.)

На прадпрыемстве заверылі, што, у сваю чаргу, і надалей будуць старацца, каб жыхары адчувалі сябе ў дамах утульна, каб больш было нагод для прафесійнага гонару.

Канешне, хочацца, каб такіх адказных спецыялістаў было як мага больш. Дарэчы, чытачы на старонках «МС» могуць расказаць і аб іншых прыкладах вырашэння іх камунальных праблем. Чаму насамрэч не падзякаваць нераўнадушным камунальнікам? Не ўсё ж так дрэнна ў камунальнай гаспадарцы, як можа падацца, калі робіш рэпартаж з чарговай «прамой лініі». І ўдвая прыемна, што ў «глыбінцы», як высвятляецца, ЖКГ можа стаць узорам для пераймання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.108. Нумар падпісаны ў 19.30 9 лютага 2016 года.

РЭКОРДНЫЯ ХУТКАСЦІ І КОЛЬЦЫ НА ЭКЗАМЕН

Для тых, хто сёлета збіраецца атрымліваць пасведчанне кіроўцы аўто, супрацоўнікі Гомельскай абласной аўтаінспекцыі могуць прапанаваць праехаць пяць кальцавых скрыжаванняў па вуліцы Кірава. Толькі пасля іх бездакорнага пераадолення экзамен будзе прыняты.

З моманту ўводу іх у дзеянне прайшло амаль паўгода, але дагэтуль бяспечны праезд выклікае пытанні нават у вопытных кіроўцаў, якія прызвычаіліся да святлафораў. Цяпер пры пераадоленні вуліцы Кірава трэба ўважліва глядзець на знакі, часцей згадваць правіла «перашкоды справа» і акуратна манеўраваць.

Між тым, гаворыць **начальнік Гомельскай абласной аўтаінспекцыі Ігар МАКУШЭНКА** *(на фота)*, гэта вялікая рэканструкцыя вуліцы прынесла чаканы вынік. Летась на Кірава ў параўнанні з аналагічным перыядам 2014-га колькасць ДТЗ паменшылася амаль у чатыры разы, а прапускная здольнасць вуліцы павялічылася ўтрая. Аўтааварыі, калі і адбываюцца, абыходзяцца без сур'ёзных наступстваў для людзей.

Дарэчы, гэта не апошнія кальцавыя перакрыжаванні на Гомельшчыне. Сёлета на скрыжаванні дарог Акцябрскі — Парычы — Рэчыца і Светлагорск — Сасновы Бор — Палессе з'явіцца аўтамабільнае кальцо.

Тым часам, прыборы фотафіксацыі канстатуюць рэкорды хуткасцяў, устаноўленыя жыхарамі Гомельшчыны. Да 192 км/г пры дазволеных 60 км/г разагнаўся кіроўца Audi ў Рагачоўскім раёне. Толькі тры кіламетры ў гадзіну саступіў яму ўладальнік аналагічнай машыны. Яго антырэкорд зафіксаваны на вуліцы Ільліча ў Гомелі. Замыкае тройку «лідараў» гамяльчанін на BMW X5, які праляцеў міма фотарадара з хуткасцю 178 км/г.

Яшчэ адна навіна — некаторыя святлафоры ў Гомелі абсталёўваюць святлодыёднай падсветкай. У абласным цэнтры падсветку не будуць уманціраваць у асфальт, яе сінхранізуюць са святлафорам. Такім чынам, пры чырвоным сігнале для пешаходаў на пераходзе будзе гарэць чырвонае святло, адпаведна, пры дазвалялым — зялёнае.

Летась на тэрыторыі Гомельскай вобласці было зарэгістравана 552 ДТЗ, у якіх загінулі 103 чалавекі. Больш чым 550 атрымалі раненні рознай ступені цяжару. Аднак у параўнанні з 2014 годам лічбы значна паменшыліся — у сярэднім амаль на 10%, паведаміў начальнік ДАІ рэгіёна Ігар Макушэнка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Сацыяльны аспект

З ІТАЛЬЯНСКІМ АКЦЭНТАМ...

Многа добрага сказана апошнім часам пра інстытуты трэцяга ўзросту, гурткі і курсы для пенсіянераў, якія ўзніклі пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Усё гэта апрабавана і паспяхова дзейнічае ў вялікіх гарадах. І прыемна бывае даведацца, што добрая справа дасягнула райцэнтраў.

У канцы снежня ў Пружанах адкрыта аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту. Яго **загадчыца Марына КАВАЛЬЧУК** расказала, што ў гуртках, на курсах займаюцца 36 чалавек. Яшчэ пяцёра выказалі намер запісацца ў бліжэйшыя дні. Так што колькасць аматараў атрымаць новыя веды і навыкі, займацца самаразвіццём расце.

Самы папулярны ў пенсіянераў гурток — вакальна-харавы. Яго кіраўнік Валянціна Антонаўна Каробка таксама на пенсіі, у мінулым работнік культуры, шмат гадоў кіравала хорам, тут выступае як валанцёр. На рэпетыцыі да яе ходзяць 19 чалавек.

А невялікая група — пакуль толькі дзевяць ахвотных — займаюцца ў гуртку па вывучэнні італьянскай мовы. Вядзе гурток загадчыца аддзялення Марына Кавальчук. Паводле яе слоў, з боку слухачоў напачатку было шмат сумненняў, няўпэўненасці. Асобныя курсанты казалі, што ім ужо не пад сілу вывучаць замежную мову. Аказалася, наадварот, яны ідуць з апераджэннем праграмы. Першыя заняткі паказалі, што мову можна вывучаць у любым узросце. Гэта спрыяе паляпшэнню памяці, трэніроўцы інтэлекту. Пенсіянеры ўжо ведаюць шмат слоў, пяюць дзве італьянскія песні.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

■

IdeaBank Отличная идея!

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Сделай вклад и выиграй»

1. Сведения об организаторе
Организатором Рекламной игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (далее – Организатор), зарегистрированное 24.04.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Лицензия на осуществление банковской деятельности №25 от 03.06.2013 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. Местонахождение Заинтересованного лица: 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, 11. УНП 80700012.

2. Сведения о Рекламной игре
Рекламная игра носит название «Сделай вклад и выиграй» (далее – Игра) и проводится с 1 декабря 2015 года по 3 марта 2016 года включительно (включая сроки выдачи призов и опубликования результатов проведения рекламной игры). Свидетельство о регистрации рекламной игры №2687 от 26.11.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.
Всего к участию в игре было допущено 1 243 участника, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры. Призовой фонд разыгран полностью.

3. Победители рекламной игры
В соответствии с Правилами Игры победителем стал 41 участник:

Победитель	Фамилия, инициалы победителя	Выигрыш
Победитель №1	Афанасьева Ю.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №2	Брайчук А.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №3	Другакова М.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №4	Дубиневич И.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №5	Есимчик В.С.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №6	Железинская Л.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №7	Ковалёва И.Е.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №8	Ковбович П.И.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №9	Козелькова Т.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №10	Король М.М.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №11	Королько Н.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №12	Кратько С.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №13	Курбатова Л.Н.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №14	Курейчик А.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №15	Лагун А.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №16	Лапаев М.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №17	Ласкавнёва Т.П.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №18	Литвинович С.Э.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №19	Лукьянчик А.П.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №20	Минчёнок А.П.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №21	Михлин М.М.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №22	Муравьёв В.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №23	Наумик С.Г.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №24	Новак М.И.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №25	Петрович М.Ф.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №26	Петроченко А.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №27	Пещерская Е. Г.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №28	Пригарин В. М.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №29	Прудников Б.К.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №30	Раксимович В.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №31	Рафальский В.М.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №32	Семенцова Т.А.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №33	Скрипченко В.В.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №34	Слабадчук М.И.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №35	Смык Н.П.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №36	Соколовская И.С.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №37	Трипук А.Ф.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №38	Харченко О.Г.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №39	Шмидт В.Э.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №40	Щецяк Д.Б.	Телевизор LG 42LF550V стоимостью 8 169 960 бел.руб., а также денежные средства в размере 1 220 799 бел. руб.
Победитель №41	Куровский С.Я.	Автомобиль NISSAN TERRANO 2.0 4WD 6MT ELEGANCE PLUS стоимостью 279 270 707 бел.руб., а также денежные средства в размере 41 730 106 бел. руб.

Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры + 375 (17) 306-33-14, 306-33-15, 7555 (для звонков с мобильных телефонов).

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 29 февраля 2016 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества	**Капитальное строение (здание картофелехранилища 1975 года постройки, кирпичное одноэтажное, после реконструкции 2008 года общей площадью 3638 м.кв. инвентарный номер в ЕГРНИ 644/С-38132) назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ**
Сведения о земельном участке	Здание расположено на земельном участке 625000000012001704 площадью 2,3832 га
Местонахождение имущества	Минская обл., Солигорский р-н, ст. Калий-1
Начальная цена	8 835 382 800 рублей
Сумма задатка	883 000 000 рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10
Балансодержатель (должник)	Коммунальное торговое унитарное предприятие «Солигорский горплодовощторг», г. Солигорск, ул. Северная, 6

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **29 февраля 2016 г. в 17.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 15.02.2016 по 25.02.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

ИЗВЕЩЕНИЕ О РЕАЛИЗАЦИИ НЕДВИЖИМОГО И ПРОЧЕГО ИМУЩЕСТВА
ОАО «Барановичидрев»
на аукционных торгах 23.02.2016 года

1	**Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны, факс и элек. почта**	Председатель ликвидационной комиссии Мищук А.М. ОАО «Барановичидрев», Брестская обл., г. Барановичи, п. Восточный, 3 тел.: 8-029-6332490 vel.; (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; mischuk_am@mail.ru
2	**Форма проведения первых повторных торгов – (турбина) и третьих повторных торгов – (объекты недвижимости) Дата, время и место проведения торгов**	Вторые повторные торги (п.3.1) – турбина и четвёртые повторные торги в форме аукциона – (п.3) объекты недвижимости (по тексту – торги или аукцион) **23 февраля 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. пос. Восточный, 3, административное здание, актовый зал**
3	**Сведения о предмете торгов, место нахождения предмета торгов, порядок ознакомления с ним и цена каждого ЛОТА в рублях Республики Беларусь, без учёта НДС 20%. Цена всех лотов снижена на 70% от первых торгов 4-е повторные торги**	**Лот №1** – объект недвижимости, незавершённое капитальное строение, с инв. №110/U-111051, пл. 16 416, 3 кв.м, здание неустановленного назначения, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость – **4.079.616.900 рублей.** **Лот №2** – объект недвижимости, незавершённое капитальное строение, с инв. №110/U-110566, пл. 559,1 кв.м, здание неустановленного назначения, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003001974 – **276.133.200 рублей.** **Лот №3** – объект недвижимости, капитальное строение с инв. №110/С-110940, пл. 851,9 кв.м, здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – цех сушильных камер, расположенное на земельном участке с кадастровым № 141000000003001974 – **346.185.000 рублей** **г. Барановичи, пос. Восточный, 3 ОАО «Барановичидрев»**
CD-R дыскі	«Урок Беларускае мовы»; «Канцэрт «Салідарныя зь Беларусьсю» на рынкавай Плошчы Новага Горада ў Варшаве 12 сакавіка 2006»; «MEGAUS MEG 16753» (канфіскаваны ў гр-на Буракова Аляксандра Уладзіміравіча)	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна ад 4 верасня 2008 года, увайшло ў законную сілу 16 верасня 2008 года
Кніжныя выданні	«Нет плохих народов», Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2007 г., 127 с.; протаіерэй Алег Чакрыгін «Читая Евангелие. Размышления на евангельские чтения. Кто мы: христиане или иудеи?», Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2005 г., 95 с. (7-е выданне); Ерчак В.М. «Слово и Дело Ивана Грозного», Мінск, ФУА Информ., 2005 г. 704 с.; «Россия пробудись. В защиту Отечества» складальнік ігумен Сімяон, Масква, «Империум-Пресс», 2005 г., 384 с.; Платонаў А.А. «Тайное мировое правительство», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Платонаў А.А. «Загадка Сионских протоколов», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Платонаў А.А. «Русское сопротивление», серыя «Война с антихристом», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Платонаў А.А. «Война с внутренним врагом», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; Барыс Міронаў «Иго иудейское», Масква, «Алгоритм», 2007 г.; Мікалай Жэвахаў «Еврейская революция», серыя «Проект Олега Платонова «Русское сопротивление», Масква, «Алгоритм», 2006 г.; «Убиение Андрея Киевского. Дело Бейлиса — «смотр сил», Мінск, «Русская идея», 2006 г.; Філімонаў В.П. «Время суда», Мінск, ЗАТ «Христианская инициатива», у 2-х тамах, 2007 г.; «Исследование Холокоста. Глобальное видение. Материалы международной Тегеранской конференции», Масква, «Алгоритм», 2007 г., 272 с.	Рашэнне суда Савецкага раёна г. Мінска ад 19 снежня 2008 года, увайшло ў законную сілу 26 лютага 2009 года
Кніжнае выданне	«Приговор убивающим Россию», Барыс Міронаў, Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2005 г.	Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 8 ліпеня 2009 года
Кніжнае выданне	«Особое мнение или обращение христианки», Алена Гнаук, Брэст, 2011 г.	Рашэнне суда Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ад 16 лістапада 2011 года, увайшло ў законную сілу 27 лістапада 2011 года
Друкаванае выданне	«Прэс-фота Беларусі 2011», выдавец: ІП Логінаў, надрукавана: Taurapolis, Каўнас, Літва, 159 с.	Рашэнне суда Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці ад 18 красавіка 2013 года, увайшло ў законную сілу 24 чэрвеня 2013 года
Кніжнае выданне	«ВЕЛЕС — БОГ РУССОВ». Неизвестная история русского народа / А.І. Бялоў. — 4-е выд. — М.: Амрита, 2012. — 272.	Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 10 студзеня 2014 года, увайшло ў законную сілу 21 студзеня 2014 года
Друкаваныя выданні	Ас-Сухеймі, Саліх. Основы веры в свете Корана и Сунны/ пер. з араб. Э. Куліева — 3-е выд., выпраўл., дап. — М.: Выдавец Эжаеў, 2008. — 304 с.; Куліеў, Эльмір. На пути к Корану. — 3-е выд., выпраўл. — М.: Выдавец Эжаеў, 2008 — 560 с.; Рабі Хадзі аль-Мадхалі. Мудрость и логика в методах призыва пророков к Аллаху. / 1-е выданне. Пераклад з арабскай Куліева. — М.: Выдав. дом «БАДР», 2000 — 152 с.; Мухамад Салех. Как ответить на три основные вопроса / Першае выданне, 2010 — 250 с. (капірайт www.Svet-Islama.com); Захарна С.Н. Тяжкие последствия актов самоубийства — Кувейт, 2005 — 128 с. Капірайт — Общество «Возрождения Исламского Наследия»; Абдуль Азіз Ар-Райіс. Нарушение единобожия. — 2008 — 130 с.; Аліхан Мусаеў. 10 прав. — 28 с.; Вероубеждение мусульманина. — 11 с.	Рашэнне суда Фрунзенскага раёна г. Мінска ад 12 сакавіка 2014 года, увайшло ў законную сілу 24 сакавіка 2014 года

Від інфармацыйнай прадукцыі	Найменне, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі	Найменне суда, які вынес рашэнне, і дата ўваходжання ў сілу рашэння суда
Кніжныя выданні	Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў цвёрдым пераплёце, 848 с.; Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў мяккай вокладцы, 848 с.; Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў мяккай вокладцы, 848 с.; Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга ў цвёрдым пераплёце, 384 с.; Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга ў мяккай вокладцы, 384 с.; Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга 694 с.; George L. Mosse. Nazi Culture. Кніга 386 с.; George Lincoln Rockwell. This Time the Wolrd. Кніга 264 с.; George Lincoln Rockwell. White Power. Кніга 466 с.; Soldier's Manual for MOS 11C — Indirect Fire Infantryman: Skill level 1. Кніга 516 с.; Soldier's Manual, MOS 11C, Indirect Fire Infantryman: Skill level 2/3/4». Кніга 900 с.	Рашэнне суда Бабруйскага раёна і г. Бабруйска ад 17 лютага 2015 года, увайшло ў законную сілу 28 лютага 2015 года
Інфармацыйныя матэрыялы	размешчаны на інфармацыйным рэсурсе ў інтэрнэце (URL https://vk.com/id210277702)	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года
Інфармацыйныя матэрыялы	размешчаны на інфармацыйных рэсурсах у інтэрнэце (URL https://vk.com/psh_soc; https://vk.com/psh_info; https://twitter.com/psh_eco; https://facebook.com/psh.by)	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года
Відэаматэрыялы	размешчаны на інфармацыйных рэсурсах у інтэрнэце (URL https://www.youtube.com/watch?v=qF-wX10MHKU; https://www.youtube.com/watch?v=FJRN6k1wzag; https://www.youtube.com/watch?v=jn7pgkcoY60; https://www.youtube.com/watch?v=2vjNW5g4Yfc)	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года
Інфармацыйныя матэрыялы	misanthropic.info misanthropic.in	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 5 жніўня 2015 года, увайшло ў законную сілу 18 жніўня 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	нагрудны знак (брошка) шэрага колеру	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 5 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 16 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	маркі ў 4-х упакоўках з выявай нацысцкай свастыкі, партрэт Адольфа Гітлера, нагрудныя знакі — 5 шт., нашыўка — 1 шт., пераводныя карцінкі — 4 шт., чайны сервіз з керамікі з 21 прадмета: кубак — 14 шт., конаўка — 2 шт., сподак — 2 шт., попельніца — 1 шт., чайнік — 1 шт., цукарніца — 1 шт.	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 5 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 16 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	блок, які складаецца з 4-х марак з выявай Адольфа Гітлера	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 5 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 16 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	манета, з металу белага колеру, дыяметрам 25 мм часоў III рэйху датаваная 1938 годам	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 15 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 27 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	упакоўка розных па форме і выяве наклеек, у тым ліку з выявай нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 15 кастрычніка 2015 года, увайшло ў законную сілу 27 кастрычніка 2015 года
Інфармацыйная прадукцыя	значок, на добрым баку якога выява арла са свастыкай і лічбамі 1942, на адвароце надпіс «TAG DER DEUTSCHEN POLIZEI» і лічбай 12	Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Мінска ад 24 лістапада 2015 года, увайшло ў законную сілу 7 снежня 2015 года
Друкаванае выданне	«К чему призывает ислам / Абу аль-Аля Маудудзі. — М.: Выдавецкі дом «АДР», 2001. — 31 с.»	Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 5 студзеня 2016 года, увайшло ў законную сілу 18 студзеня 2016 года

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

ОРГАНИЗАТОР: КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

№ лота	Вид аукциона, целевое назначение	Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер	Условия и ограничения	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
1.	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Курмелевка, ул. Центральная, У-5А Лепельского района, площадь 0,2319 га, кадастровый номер 222781707601000039	- водоохранная зона озера «Ладосно»; - получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	8 000 000	800 000

1. Аукцион состоится **11 марта 2016 года в 15.00** по адресу: Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а.

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а, Каменский сельский исполнительный комитет.

Последний день приема заявлений – **07.03.2016 года до 17.00.**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10% от начальной цены объекта аукциона в кассу Каменского сельисполкома.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования.

Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющий личность, а также предъявляет паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, публикацию в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: **8(02132) 2-39-62; 8 (029) 713-99-41.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится 23 февраля 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости и иного имущества, не относящегося к государственной собственности, а также аукционов на право заключения договоров аренды нежилых помещений, утвержденной приказом №5а от 22.01.2014 г.

№ лота	Наименование предмета торгов, местонахождение имущества, условия оплаты	Краткая характеристика предмета торгов	Начальная цена, белорусских рублей (с НДС)	Задаток, белорусских рублей
1	**Двухэтажное кирпичное нежилое здание (330/С-13595), расположено по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 3.** **Условия оплаты: в течение срока, установленного договором купли-продажи**	Двухэтажное кирпичное здание, перекрытия – железобетонные, крыша – рулонная совмещенная. Общая площадь – 296,7 м². Год постройки – 1969 г. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000014000004 площадью 0,0506 га. Земельный участок предоставлен на праве постоянного пользования. Иные строения на земельном участке отсутствуют	1 080 000 000	50 000 000

Первоначальное извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» №177 (28035) от 15.09.2015 г.

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельторгтехника», 246043, Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 161.

Организатор торгов: Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Региональное инвестиционное агентство «ГомельИнвест», г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, тел. (0232) 25 49 00, факс (0232) 25 49 01.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с 3012113129041 в Региональной Дирекции №300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель платежа – ГП «РИА «ГомельИнвест», УНП 490779270. Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе 23 февраля 2016 г.».

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, (резиденты и нерезиденты Республики Беларусь), подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и подавшие своевременно необходимые документы.

Документы для участия принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по 19.02.2016 г. включительно.

Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подавшие в установленный срок заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию **с 10.00 до 11.00 23 февраля 2016 г.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов.

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан:

- подписать протокол о результатах аукциона;
- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов возместить Организатору вознаграждение, включая фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. Размер вознаграждения составляет 4% от начальной цены проданного с аукциона объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;
- в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов;
- в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона (единственным участником, не пожелавшим купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%), возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Задаток участника аукциона, ставшим Победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), засчитывается в счет окончательной стоимости предмета торгов.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет пятьдесят базовых величин за каждый случай нарушения.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Справки по тел. **(029) 679 02 81.**

Для ознакомления с объектом звонить **(0236) 32 44 76.**

http://www.gomelinvest.by

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**ЛОТ № 1.** Автомобиль RENULT DUSTER, 2015 г.в., гос. № 6009ЕС2, начальная стоимость лота – 185 767 000 белорусских рублей. **ЛОТ № 2.** Автомобиль ВАЗ 2123 CHEVROLET NIVA, 2010 г.в., гос. № 2070ВТ2, начальная стоимость лота – 98 091 000 белорусских рублей
Собственник (владелец) имущества	Государственное сельскохозяйственное учреждение «Лепельская сортоиспытательная станция»
Местонахождение имущества	Витебская область, Лепельский р-н, д. Адамовка По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ГСУ «Лепельская сортоиспытательная станция» Кисилевичу Михаилу Леонидовичу, тел. 8 (029) 669 87 21
Наличие обременений	Не имеется
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 25 февраля 2016 года в 11.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4. Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 10.00 24 февраля 2016 г.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

22 февраля 2016 года в 14.00

СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Вишневка-2010»

по адресу: Минская область, Минский район, агрогородок Вишневка, ул. Центральная, 1А (актовый зал)

ПОВЕСТКА ДНЯ:

- О даче разрешения директору ОАО «Вишневка-2010» на отчуждение неиспользуемого имущества.

- О даче разрешения директору ОАО «Вишневка-2010» на продажу жилого помещения.

- О рассмотрении локального нормативного акта ОАО «Вишневка-2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 22 февраля 2016 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный Совет ОАО «Вишневка-2010».

УНП 600041880

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА ОБЪЕКТА «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом № 7 по генплану»)

Информация о застройщике

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства – 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
7. Жилой дом № 28 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
8. Жилой дом № 7 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
9. Жилой дом № 9 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 8 месяцев.
10. Жилой дом № 32 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 11 месяцев.
11. Жилой дом № 11 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
12. Жилой дом № 85 по ул. Неманской, фактический срок строительства – 18 месяцев.
13. Жилой дом № 21 по ул. Налибокской, фактический срок строительства – 18 месяцев.
14. Жилой дом № 24 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
15. Жилой дом № 60 по ул. Каменногорской, фактический срок строительства – 11 месяцев.
16. Жилой дом № 34 по ул. М. Горецкого, фактический срок строительства – 8 месяцев.

Информация о проекте и об объекте строительства

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома.

Положительные заключения государственной экспертизы от 16.11.2012 № 1010-15/12; от 22.10.2015 № 810-15/15.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 7 по генплану в застройке микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь строительства.

Характеристика объекта

Объект – 132-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М111-90 со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

1, 2, 3-комнатные квартиры при поэтапной оплате – 19 000 000 руб.

1, 2, 3-комнатные квартиры при 100% оплате в течение 20 банковских дней с момента заключения договора – 17 000 000 руб.

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застрой

■ Свая справа

«Трэба часцей прыслухоўвацца да сябе»

Віцебскі рамеснік, умеючы будаваць дамы ды вырошчваць жэньшэнь, зарабляе на жыццё ўпрыгажэннямі

Харызматычнага, барадатага Руслана ШЫХАВА цяжка заспець без справы. Звычайна ён альбо ў майстэрні, альбо ў паездцы, дзе прадае свае вырабы з жалеза, медзі ды латуні... Дарэчы, на апошнім «Млыне» (кірмаш вырабаў ручной працы. — Н.Д.) мы з мужам гандлявалі побач з Русланам. Звярнула ўвагу, што ў яго не было адбою ад жанчын. Яшчэ больш здзівілася, калі сярод пастаянных пакупнікоў убачыла сваю калегу па працы. Аказалася — упрыгажэнні яе слабасць. Перавагу аддае этнічным. Але ў Беларусі іх, на жаль, мала хто выраблявае...

«Бессэнсоўныя рэчы рабіць наогул нельга»

— Руслан, як ты прыйшоў да металу? З чаго пачынаў?

— Збіраў яго на вуліцы, колькі сябе памятаю. Увесь балкон быў завалены ўсялякім металічным хламам. Рабіў з яго трамвайчыкі, авіямадэлі, тэлескопы. Мяне заўсёды цягнула да зорак, таму пасля школы паступаў у Кіеўскі ўніверсітэт на фізіку космасу, але правалiў іспыты. У выніку атрымаў спецыяльнасць токара. Гэта ўзмацніла маю цягу да металу. Я адчуў, што з яго можна ляпіць усё, што заўгодна. Але для таго, каб метал пачаў з табой узаемадзейнічаць, паказваць сваю ўнутраную прыроду, трэба праявіць волю і цярпенне. Цяпер метал мяне корміць, калі можна так сказаць. Гэта мая прафесія і захапленне адначасова, і нават светапогляд у нейкім сэнсе. У кожны свой выраб укладаю вызначаную ідэю, сэнс. Лічу, што бессэнсоўныя рэчы рабіць наогул нельга. Ну як наша жыццё — яно павінна мець мэту. Людзі, якія губляюць яе (альбо не могуць сфармуляваць для сябе), жывуць напалову. Не разумею, як можна займацца тым, што не стасуецца з тваёй жыццёвай мэтай?

— А якая ў цябе мэта?

— Я кіруюся ў жыцці ідэяй прыгажосці. Раблю не проста так, што з-пад малатка выйдзе, а тое, што мэтанакіравана нясе ў сабе прыгажосць. У нас у Віцебску на вуліцы Суворава гандлююць магніцікамі, на некаторых — карціны мастакоў. Многія свядома адлюстроўваюць пачварныя целы, пахабшчыну. Асабліва жудасна, калі мастак спрабуе прынізіць жанчыну. Я такіх называю мастакамі-знішчальнікамі. Замест таго, каб зачыняць дзверы хаосу, не дапускаць яго ў нашы душы, яны наадварот іх адчыняюць. Калі вярнуцца да маіх вырабаў, то, магчыма, некаму яны пададуцца грубымі. Але ў гэтай грубасці свая прыгажосць, яна абвострана перадае энергію, якая прысутнічае ў рэчы. За прылізанасцю можна схаваць крыніцу энергіі любога прадмета.

Просяць зрабіць пярсцёнак з чарапамі, сатанінскімі знакамі. Я адразу ж адмаўляюся, не раблю прынцыпова ні за якія грошы. Гэта грэх, бо ты выпускаеш дэмана, сілу, якая стане непадуладнай.

— Што ты ўкладаеш у паняцце прыгажосць?

— Я згодны са Святаславам Рэрыхам, што «прыгажосць з'яўляецца канчатковай мэтай любой дадзенай камбінацыі». Вялікае майстэрства — адчуваць прыгажосць самога працэсу: атрымліваць ад яго задавальненне, а не панічна гнацца за вынікам. Прыгажосць — гэта суладдзе: высокі стан, да якога мы ўсе павінны імкнуцца.

«Калі жанчына задаволена сабой, усім навокал добра»

— Чаму вырашыў спыніцца менавіта на жаночых упрагажэннях?

— Я раблю пярсцёнкі, амулеты, падвескі і для мужчын таксама. Проста, жаночых упрыгажэнняў у асартыменце больш, таму і складваецца такое ўражанне *(усміхаецца)*... Жанчына, калі параўноўваць з мужчынам, больш тонка арганізаваная. Яна патрабуе большай разнастайнасці колераў, гукаў, адчуванняў. Ведаю гэта не па чутках, бо больш як 20 гадоў чытаў лекцыі па філасофіі, Агні-ёзе, у тым ліку і на тэму жаночай псіхалогіі. На кірмашах за год кантактую з вялікай колькасцю жанчын. Кожная хоча неяк сябе ўпрыгожыць, штосьці выбірае. Да кожнай патрэбны свой падыход. У сувязі з гэтым павінен быць вялізны выбар жаночых упрыгажэнняў. Калі жанчына задаволена сабой, сваім вобразам, сваімі ўнутранымі адчуваннямі, усім навокал добра: і мужу, і дзецям, і самой прыродзе.

— Што тычыцца сімвалаў, гэта ў цябе дакладныя копіі? Адкуль бярэш формы?

— Я з дзяцінства захапляўся гісторыяй розных народаў. У прыватнасці мяне цікавіла наша славянская культура, усходняя. Выкарыстоўваю пераважна сонечную сімволіку. А яна адлюстроўвалася спіраллю, кругам, крыжамі, вызначанымі кропкамі, жывёламі, птушкамі. Сонца — сімвал свядомасці ў чалавеку, розуму, унутранай эвалюцыі, жыццёвых сіл. Стараюся ў кожную форму прыўнесці сваё бачанне, адаптаваць яе да нашага часу. Ведаю майстроў, якія робяць дакладныя копіі этнічных вырабаў, ім вельмі складана іх прадаць.

«Можаш не пісаць — не пішы»

— Ці хапае табе сродкаў для жыцця?

— Каб жыць годна, будучы рамеснікам, трэба рабіць тое, што патрэбна людзям, і вельмі шмат працаваць. Гэта не тая праца, як на заводзе: чалавек 8 гадзін адпрацаваў і ўсё. Я кладуся спаць, а ў мяне перад вачыма круцяцца новыя формы. Ляжу і думаю: якая тэхналогія можа быць. Вельмі часта прачынаюся з гэтай думкай. Рамеснік — гэта не праца, гэта лад жыцця.

— Што апроч жадання зарабіць прымушае цябе штодзень ісці ў майстэрню?

— Яшчэ Леў Талстой казаў: «Калі можаш не пісаць — не пішы». Гэта не пра мяне. Калі дзень не заходжу ў майстэрню...

— Зуд у руках пачынаецца?

— І ў мазгах таксама *(смяецца)*.

— Ці павінен рамеснік быць таксама і гандляром?

— Ведаю некалькі майстроў вельмі высокага ўзроўню, але яны не могуць прадаць свае вырабы. Не атрымліваецца: альбо харызмы няма, альбо саромеюцца. Таму яны наймаюць прадаўцоў. У кожнага свой спосаб. Нехта спрабуе прадаваць свае вырабы ў родным горадзе, праз інтэрнэт, нехта здае ў крамы, салоны. Я аддаю перавагу актыўным продажам: удзельнічаю ў кірмашах, у тым ліку і за межамі Беларусі. Тут шмат плюсоў: я не толькі непасрэдна кантактую са сваімі пакупнікамі і адчуваю, што ім патрэбна, але і адкрываю для сябе новыя мясціны.

Жыццё павінна мець мэту. Людзі, якія губляюць яе (альбо не могуць сфармуляваць для сябе), жывуць напалову.

— Ты расказваў, як аднойчы падчас гандлю да цябе падышоў чалавек і запытаўся: «А вы не баіцеся, што ў вас нешта скрадуць?» Твой адказ быў: «А мне чаго баяцца?» Можаш пракаментаваць?

— Зразумела, ёсць людзі, якія могуць і скрасці. Таму трэба максімальна паклапаціцца пра бяспеку, каб нікога не правакаваць. Але калі за справу бярэцца прафесіянал, ён скрадзе ў цябе ўсё што захоча, ты і вокам не паспееш міргнуць. Чалавек, які бярэ тое, што яму не належыць, абавязкова будзе гэта аддаваць у тым ці іншым выглядзе. ...Я ж любую сваю страту ўспрымаю па-філасофску: як расплату за тое, што сам калісьці запазычыў. Чалавек крадзе, не таму, што рэч дарагая (гэта ж не золата і не срэбра), а таму, што спадабалася. А раз спадабалася, няхай. Хто ведае, можа гэта рэч неяк перародзіць яго свядомасць. Я, бывае, дару свае вырабы: узнікае такое ўнутранае жаданне. А вось калі кажуць «давайце таргавацца»... Не люблю я гэтага. Сам ніколі не таргуюся. Мне кажуць цану — і я або купляю, або не. Праўда, калі бачу, што чалавек не можа набыць нейкую з маіх работ, але вельмі хоча, саступаю.

— Ці часта сустракаеш людзей у сваіх упрыгажэннях на вуліцы?

— Я, магчыма, не заўсёды ўважлівы. Часцей мне сябры кажуць: «Бачылі твае ўпрыгажэнні». Але была адна цікавая сітуацыя. У Расіі дзяўчына брала ў мяне завушніцы: такія вялікія, нават крыху дзікія. Далёка не ўсім яны пасуюць. А ёй былі да твару. Пасля, праз гады тры, гляджу Малахаў запрасіў сям'ю Максімавых на сваё ток-шоу. Тамару Максімаву многія ведаюць, яна доўгі час вяла «Музычны рынг» на тэлебачанні. Яе дачка — оперная спявачка. Гляджу, яна ў маіх завушніцах на перадачу прыйшла...

Цікавае супадзенне: талісман Руслана ШЫХАВА — молат.

«Не ўяўляю сябе без барады»

— Ты казаў, што лепшы адпачынак — гэта змена роду дзейнасці?

— Знакамітыя людзі, якія многага дасягнулі ў жыцці, кіраваліся менавіта гэтым правілам. Той жа самы Мікалай Рэрых маляваў адразу 3-4 карціны. Кожная несла ў сабе свой сюжэт, свае фарбы. Так ён адпачываў. Леанарада да Вінчы спалучаў у сабе мастака, скульптара, архітэктара, інжынера-вынаходніка, палітыка. Такім чынам ён дасягнуў выніку. Як у мяне? Цяжка працаваць увесь дзень у майстэрні, вочы стамляюцца, таму пастаянна пераключаюся з аднаго металу на іншы. Ці іду чытаю, прычым адразу некалькі розных кніг па характары і змесце. Вось дом пабудаваў, цяпер рамонтам займаюся. І такім чынам таксама адпачываю.

— Ці сапраўды ты спрабаваў вырасціць жэньшэнь у тайзе?

— Пасля службы ў войску я застаўся жыць на Далёкім Усходзе. Працаваў у тайзе, у аграатрадзе. Нашай задачай было ачысціць участак ад дрэў, выкапаць ямы, запоўніць іх гумусам, знайсці жэньшэнь, сабраць насенне, пасеяць і даглядаць яго. Так я і працаваў. Праўда, нядоўга. Давялося адтуль з'ехаць, але ўражанні засталіся на ўсё жыццё. Гэта непередавальнае адчуванне, калі ты начуеш адзін у вялікім намёце... Тайга, вогнішча, бясконцы прастор неба...

— Ты неяк сказаў, што з пяці гадоў носіш бараду. Гэта як?

— У думках *(смяецца)*. Напэўна, я ў мінулых жыццях быў барадатым. Гэта настолькі ўва мне адбілася, што я з дзяцінства хацеў насіць бараду. Аднойчы нават намаляваў яе сабе і пайшоў у краму. Смешна, напэўна, было: ідзе маленькі хлопчык... з барадой. Прычым у Азербайджане, дзе мы тады жылі, не прынята насіць бараду, толькі вусы.

— Руслан, вось ты шмат чаго ўмееш: і жэньшэнь вырошчваць, і дамы будаваць... Чаму ўсё ж такі вырашыў зарабляць на жыццё ўпрыгажэннямі?

— У мяне ўжо не тыя ўнутраны сілы, здароўе і ўзрост, каб будаваць дамы *(усміхаецца)*. Таму знайшоў для сябе найбольш прымальны спосаб зарабіць. Спачатку была думка: а ці не вывучыць астралогію ды займацца складаннем гараскопаў за грошы. Я ж гадаў на рунах у свой час. Не спецыяльна, а па ходзе гандлю. Гэта, павер, магло б прыносіць большы даход, чым мае продажы: да мяне стаялі куды большыя чэргі, чым цяпер. Але я гэтую справу кінуў. Бо зразумеў, што яна не дае ані мне, ані чалавеку нейкага ўнутранага завяршэння. Так, разавая акцыя. Зарабляць можна рознымі спосабамі. Я ў свой час займаўся сталяркай, потым перайшоў на сувенірку. Пасля адчуў, што гэта не дае тое, што мне патрэбна, і перайшоў на метал, на ўпрыгажэнні. Трэба часцей прыслухоўвацца да сябе і не баяцца штосьці мяняць.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
Фота аўтара.
dryla@zviazda.by

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Выбар насення гэтай культуры велізарны, розныя крытэрыі: па форме плода, яго афарбоўцы, тэрмінах паспявання, умовах вырошчвання.

ВЫБІРАЕМ ГАТУНКІ САЛОДКАГА ПЕРЦУ

Вясна ўсё бліжэй, час задумацца пра пасевы гародніны на расаду. Давайце паспрабуем сарыентавацца ў гатунках салодкага перцу.

Перац — удалая культура для дэкаратыўнага агарода. Выведзеныя гатункі і гібрыды для вырошчвання ў кантэйнерах — выдатны варыянт для тых, хто марыць атрымаць ураджай на балконе або падаконніку. Што ж важна ўлічыць пры набыцці насення?

Гатунак або гібрыд

Гэты параметр асабліва важны для тых, хто прывык выкарыстоўваць пераважна ўласнае насенне. Калі на выбранай вамі ўпакоўцы стаіць F1, улічыце: з гэтай расліны нарыхтоўваць насенне не варта. Нават калі вам удасца атрымаць насенне ўпадабанага гібрыда, расліны, якія вырастуць з яго, могуць апынуцца зусім не падобнымі на тыя, якія радавалі вас сваімі пладамі. Насенне гібрыдных перцаў штогод давядзецца купляць.

Але ў гібрыдаў ёсць немалыя перавагі:

• па-першае, большасць з іх мае высокую ўраджайнасць і адрозніваецца буйнымі пладамі з добрымі смакавымі якасцямі;

• па-другое, яны больш устойлівыя да хвароб, чым гатунковыя расліны.

Тэрмін паспявання

Аптымальны варыянт — саджаць расліны з розным тэрмінам паспявання. Так можна доўгі час атрымліваць свежыя плады, што важна, паколькі лёжкасць у салодкага перцу, як правіла, не вельмі высокая. Але ў рэгіёнах з халодным кліматам вырасціць познаспелыя гатункі без выкарыстання цяпліц немагчыма.

Для арыенціра:

• у ранніх сартоў тэрмін паспявання складае ад 80 да 100 дзён;

• сярэдняспелыя гатункі і гібрыды даюць ураджай праз 115—130 дзён;

• познім спатрэбіцца да 140 дзён.

Памер і форма

Гэта важна, калі вам патрэбен салодкі перац для фаршыравання (у такім выпадку зручней таўстасценныя плады круглай або авальнай формы), а таксама ў тым выпадку, калі вы саджаеце гэтую культуру ў дэкаратыўным агародзе.

Плады ў салодкага перцу могуць быць падоўжанымі, конусападобнымі, цыліндрычнымі, кубападобнымі, авальнымі ці амаль шарападобнымі; яны бываюць гладкімі і бугрыстымі, з выяўленымі падоўжнымі рэбрамі або без іх.

Колер

Яркія плады перцу вельмі дэкаратыўныя. Аднак варта ўлічыць, што колер праяўляецца па меры паспявання — у фазе тэхнічнай спеласці практычна ўсе перцы маюць зялёную афарбоўку розных адценняў (ад пяшчотна-салатавага да цёмна-зялёнага), і толькі да моманту поўнай спеласці выяўляюцца ўсе ўласцівыя гатунку каляровыя асаблівасці пладоў.

Умовы вырошчвання

Перац — цеплалюбівая культура. Многія гібрыды салодкага перцу прызначаныя менавіта для пасадкі ў цяпліцы, аднак нямала гатункаў і гібрыдаў, прыдатных як для закрытага, так і для адкрытага грунту. Калі вы хочаце вырасціць перац ва ўмовах хатняга агарода — на падаконніку або балконе, лоджыі, лепш выбіраць гатункі, прызначаныя для кантэйнернай пасадкі.

З іншых адметных прыкмет варта звярнуць увагу на вышыню расліны — яна можа вагацца ад 30—35 да 150—170 см. Некаторыя гатункі патрабавальныя да фарміравання куста, патрабуюць выдалення бакавога лісця і ніжніх парасткаў.

ПОПЕЛ ДЛЯ ГЛЕБЫ

Зімой даводзіцца напоўніцу паліць печкі, падтрымліваць агонь у камінах. Гэта час назапашвання вельмі каштоўнага ўгнаення. Асабліва, калі выкарыстоўваць будзем дровы не з іглічных парод дрэў.

Попел падыходзіць практычна для любой глебы. Яго можна ўносіць пад любыя культуры. Ён багаты калiем, кальцыем, фосфарам, магніем і масай мікраэлементаў. Дарэчы, у попеле іглічных парод калію менш за ўсё, каля 3—7%.

Галоўным, што робіць унясенне попелу ў глебу карысным для любой глебы, з'яўляецца спосаб, якім мы абагачаем ім глебу. Гэта можа быць проста рассыпанне попелу на зямлю з наступным яе рыхленнем або ўнясенне ў пасадачную яму. А можа быць унясенне воднай выцяжкі, настой попелу.

Пры дапамозе простага рассыпання попел уносяць у глебы, у якіх адчуваецца недахоп калію, фосфару і вапны.

Калі ж глеба і без таго багатая вапнай, то попел уносіць россыпам нельга. На такой глебе расліны падкормліваюць настоем попелу. Для прыгатавання настою попелу зліваюць выцяжку, пакідаючы асадак, які і ўяўляе сабой у асноўным вапну. І ўжо гэтым настоем, разведзеным вадой, падкормліваюць расліны шляхам паліву або апырскавання.

Увесну ў попельны раствор можна дадаць 30 г мачавіны на вядро вады, а ўвосень — монафасфат калію ў такой жа колькасці.

Захоўваць попел трэба ў сухім месцы, інакш з яго моцна вымываецца калій.

Для даведкі: у адной шкляніцы —100 г попелу, у паўлітровым слоіку — 250 г, а ў сталовай лыжцы — 6 г.

Даты | Падзеі | Людзі

10 ЛЮТАГА

1636 год — дзень нараджэння праса: яго першае дакументальнае згадванне адбылося роўна 380 гадоў таму. Першы запіс аб прасе знойдзены ў кнізе выдаткаў маскоўскага царскага двара. Прас каштаваў у той час 5 алтын, важыў каля 10 кілаграмаў і быў маналітным. У нашых краях карысталіся духавымі прасамі, у якіх адкідвалася вечка для загрузкі вугалю, а для іх раздзімання трэба было перыядычна дзьмуць у бакавыя адтуліны на прасе. Былі і спіртавыя прасы, якія нагадвалі газавую лямпу. Паверхня такога праса награвалася спіртам, залітым унутр, які падпальвалі па меры неабходнасці. З-за дэфіцыту спірту такое прыстасаванне доўга не праіснавала. І наогул прасы былі даступныя нешматлікім сем'ям. Са з'яўленнем электрычнасці і развіццём тэхнікі, з'явіліся электрычныя прасы. З пункту гледжання электратэхнікі, іх прынцып грунтуецца на выдзяленні цеплавой энергіі пры праходжанні электрычнага току праз рэзістыўны награвальны элемент.

1911 год — 105 гадоў таму нарадзіўся Мсціслаў Усеваладавіч Келдыш, савецкі матэматык і механік, тэарэтык касманаўтыкі, акадэмік АН СССР, прэзідэнт АН СССР, тройчы Герой Сацыялістычнай Працы. Даследчык праблем авіяцыйнай і атамнай тэхнікі, вылічальнай і машыннай матэматыкі. Кіраўнік шэрагу савецкіх касмічных праграм, уключаючы палёты чалавека ў космас. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Ленінскай прэміі.



1921 год — пастановай ЦВК БССР пры Наркамасветы створана Навукова-тэрміналагічная камісія. Складалася з гуманітарнай (літаратурна-мастацкай) прыродазнаўчай і матэматычнай секцый. Старшыня — С. М. Некрашэвіч, загадчык гуманітарнай секцыі Я. Купала. Займалася распрацоўкай і складаннем беларускай тэрміналогіі па граматыцы, логіцы, арыфметыцы, алгебры, геаметрыі, заалогіі (амаль 3 тысячы тэрмінаў). Тэрміны ў выглядзе спецыяльных падборак друкаваліся ў часопісе «Веснік Народнага камісарыята асветы». Большасць распрацаваных тэрмінаў захоўваецца ў сучаснай беларускай мове і цяпер. Камісія падрыхтавала і выдала некалькі падручнікаў для пачатковых і сярэдніх школ. На базе яе 30 студзеня 1922 г. заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт).

Было сказана

Змітрок АСТАПЕНКА, паэт:
«Адрозніць вельмі лёгка ад жывых таго, каго жыццё жадае сцерці».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.41	18.07	9.26
Віцебск	8.34	17.53	9.19
Магілёў	8.31	17.57	9.26
Гомель	8.23	17.59	9.36
Гродна	8.55	18.23	9.28
Брэст	8.55	18.28	9.33

Месяц

Маладзік 08.02—14.02.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Паўла, Уладзіміра, Фёдара, Яфрэма.*
К. *Элізы, Эльвіры, Габрыэля.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+2..+4°C	КІЕЎ	+2..+4°C	РЫГА	+3..+5°C
ВІЛЬНЮС	+2..+4°C	МАСКВА	-2..0°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+3..+5°C

УСМІХНЕМСЯ

Бясплатным урачам ніяк не можаш даказаць, што ты хворы, а платным — што здаровы.

— Як ты сябе адчуваеш, дружа? Ужо ажаніўся або працягваеш сам гатаваць сабе ежу?

— І тое, і другое.

Для каханай жанчыны нічога не шкада, пакуль ёй нічога не трэба.

— Што зрабіць з чалавекам, які робіць табе гадасці?

— Напішы яму ліст з прэтэнзіямі і спалі.

— Зразумела... А з лістом што рабіць?

Мне ўчора сказалі, што я жыву фантазіямі. Я ледзь з дракона не ўпаў.

Малюнак Сяргея ВОЛКАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.108. Індэкс 63850. Зак. № 589.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 лютага 2016 года.